Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 СТУДЗЕНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 1 (28111) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Раўнапраўе — норма для беларусаў**

СТАР. 4



**Як чужыя дзеці сталі сваімі**

СТАР. 5



**Усё пра пенсію па ўзросце**

СТАР. 6

# НАШЫ НАЙВЯЛІКШЫЯ КАШТОЎНАСЦІ: СПАКОЙ, МІР, ЗГОДА

## Навагодні зварот Прэзідэнта да беларускага народа

Дарагія суайчыннікі!

Новы год нездарма называюць казачным святам. Ён абнаўляе прывычны свет, прыўносіць цудоўную атмасферу ўрачыстасці. Тое, што здавалася шэрым і сумным, раптам пачынае іграць яркімі фарбамі.

У гэты момант разумееш, як важна любіць і цаніць жыццё, якое яно цудоўнае і цікавае, якое непаўторнае кожнае яго імгненне.

Адыходзячы год нагадаў усяму свету простую ісціну, якую многія сталі забываць. Жыццё — найвялікшая каштоўнасць на зямлі. І права на яго — самае галоўнае з усіх правоў чалавека. На жаль, менавіта яно ў сучасным свеце знаходзіцца пад найбольшай пагрозай.

За апошні год свет не стаў спакайнейшым. Ад тэрактаў і ваенных канфліктаў гіне ўсё больш людзей. У самых розных кутках планеты ўсё гучней галасы тых палітыкаў, хто ставіць свае амбіцыі вышэй за дабрабыт народаў.

Відавочна, што старое светаўладкаванне разбураецца. Ідзе новы перадзел свету, які не прынясе людзям нічога, акрамя бед і пакут.

У гэтай абстаноўцы мы яшчэ вастрэй адчуваем велізарную каштоўнасць спакою, міру і згоды ў нашай краіне. На вялікае шчасце, нам удаецца ўберагчы Беларусь ад войнаў, тэрарызму і ўнутранай смуты. Дапамагае нам у гэтым і гістарычная памяць народа, які перажыў на сваім вяку неймаверныя пакуты і незамерныя страты.

Сімвалічна, што ў адыходзячым годзе, захоўваючы сувязь гераічнага мінулага з сучасным, мы адсвяткавалі 70-годдзе Вялікай Перамогі. Яе лёсавызначальнае значэнне для Беларусі застаецца адвечным.



Фота БЕЛТА.

І колькі б гадоў ні мінула, мы заўсёды будзем шанаваць подзвіг нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў, якія вызвалілі родную зямлю і заваявалі незалежнасць.

Дарагія сябры!

У 2015 годзе ў нас прайшлі прэзідэнцкія выбары. Мы выбіралі наш шлях, наш лёс на бліжэйшыя пяць гадоў. У кожнага была магчымасць спакойна ўспомніць мінулае, ацаніць сучаснае і вызначыць сваю будучыню.

Мы разам выбралі мір і парадак, спакой і прадказальнасць, свабоду і незалежнасць Беларусі.

Сёння грамадства чакае руху наперад. Скажу цвёрда: Беларусь пойдзе шляхам развіцця і прагрэсу. Гэта будуць разумныя перамены, зразумелыя людзям, а не шлях абвалу, ломкі і рэвалюцый.

Мы не маем права страціць нашы галоўныя каштоўнасці — згоду ў грамадстве, адзінства народа і суверэнітэт краіны.

Сёння ўсім нам няпроста. Войны і разлад у свеце вядуць да крызісу ў эканоміцы. У дваццаць першым стагоддзі ўсе краіны звязаны паміж сабой тысячамі ніцей. Беды і непарадкі ў бліжэйшых і далёкіх суседзяў неадкладна б'юць і па нашай краіне.

Няма ніякіх сумненняў — калі мы захаваем адзінства грамадства, то, як і ў папярэдніх гады, пераадолеем любыя цяжкасці і выпрабаванні.

Нам усім неабходна быць больш уважлівымі і добрымі адзін да аднаго. Давайце не будзем растрачваць сілы на крыўды, папрокі і сваркі.

У патоку штодзённай мітусні і клопатаў кожнаму з нас варта задумацца і азірнуцца вакол.

Мы ўбачым прыгожую краіну, нашу родную беларускую зямлю, мноства слаўных і добрых людзей. І зразумеем самае галоўнае — кожны дзень адбываецца цуд: нараджаюцца дзеці. А з імі — новыя надзеі і новая будучыня.

Стагоддзямі людзі спрачаліся аб тым, для чаго народжаны чалавек, у чым сэнс яго жыцця. Верагодна, гэтыя разважанні будуць прадаўжацца да таго часу, пакуль існуе чалавецтва.

Але, напэўна, я не паграшу супраць ісціны, калі скажу — чалавек народжаны для радасці і шчасця. Толькі парадокс у тым, што часам людзі шукаюць шчасце ў далёкіх далях, не заўважаючы, што яно зусім побач. Яго можна знайсці ў працы, творчасці, спорце, у сваім жыцці, у дзецях. Важна ўмець своечасова разгледзець яго, і галоўнае — не прайсці міма.

Таму маё самае галоўнае навагодняе пажаданне кожнаму з вас — знайдзіце сваё шчасце і не прайдзіце міма яго! Цаніце жыццё, цаніце кожнае яго імгненне, радуйцеся і дзяліцеся радасцю з тымі, хто побач.

У апошнія хвіліны адыходзячага года мне хочацца пажадаць дабрабыту вам і вашым дзецям.

Мае асаблівыя віншаванні нашым любімым, непаўторным беларускім жанчынам. Няхай вашы прыгажосць, абаянне і цяпло сэрцаў азараюць нас кожную хвіліну.

Ад усёй душы віншую:

ветэранаў, пажылых людзей, якія абаранілі і ўзнялі з руін нашу Радзіму, стварылі фундамент яе развіцця;

рабочых, сялян, будаўнікоў, інжынераў, вучоных, якія сваёй працай прымнажаюць багацце краіны;

урачоў і настаўнікаў, якія дораць нам здароўе фізічнае і духоўнае;

радавых і афіцэраў, усіх, хто служыць дзяржаве, ахоўвае незалежнасць, мір і парадак у Беларусі!

І няхай чароўнае ласкавае свята навагодняга свята не згасае ўвесь будучы год!

Здароўя, любові, дабра вам, дарагія сябры!

З Новым годам!

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

*«Культура — твар любой дзяржавы, таму ніколі не трэба шкадаваць на яе ні сіл, ні сродкаў: яны вернуцца, памножаныя ў сто разоў. Там, дзе культура знаходзіцца на годным узроўні, наогул адзначаецца высокае развіццё дзяржавы. У нас у краіне надаецца шмат увагі захаванню гісторыка-культурнай спадчыны, падтрыманню традыцый, развіццю нацыянальнага мастацтва. За апошнія 20 гадоў аднаўлена мноства храмаў, адрэстаўраваны і створаны музеі і іншыя ўстановы культуры. І не толькі ў сталіцы і абласных цэнтрах, але і ў раёнах».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.01.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18 628,00 | ▲ |
| Еўра | 20 309,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 255,04 | ▼ |
| Укр. грыўня | 772,00 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ХАКЕЙ — СВЯТА СЯМЕЙНАЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхары Мінска, суседзі Павел КУРЧЭЙ і Кацярына ГАРДЗІЕЎСКАЯ са сваімі дзецьмі, ідуць на хакейны матч XII Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які стартаваў учора ў сталіцы.**

# ПРЫСУДЖАНЫ ПРЭМІІ «ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ» І СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ПРЭМІІ ДЗЕЯЧАМ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА 2015 ГОДА

**Адпаведныя ўказы кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 30 снежня, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Рашэннем кіраўніка дзяржавы па выніках 2015 года прысуджаны 5 прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Імі адзначаны аўтарскія і працоўныя калектывы за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы.

Сярод лаўрэатаў гэтай высокай узнагароды аўтарскі калектыў у складзе пазаштатнага супрацоўніка галоўнай дырэкцыі міжнароднага вяшчання Беларускага радыё Алены Харашэвіч і прафесара кафедры крымінальна-выканаўчага права Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Анатоля Шаркова. Іх намаганнямі створана кніга-рэквіем «Жыць і помніць», у якой абагульнены вынікі работы па вызначэнні і вывучэнні месц пахавання беларусаў — абаронцаў Айчыны ў розных кутках Еўропы.

Прэміяй адзначаны епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веньямін, які ўнёс важкі ўклад у духоўнае адраджэнне Беларусі, асветную і дабрачынную дзейнасць.

Лаўрэатам прэміі стаў калектыў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця», які дасягнуў значных поспехаў у рэалізацыі мерапрыемстваў па захаванні жыцця і здароўя маці і дзяцей.

Узнагароды ўдастоены таксама калектыў Нацыянальнага мастацкага музея, які паспяхова рэалізаваў буйнамаштабныя выставачныя праекты, накіраваныя на ўмацаванне духоўных каштоўнасцей у сучасным грамадстве.

У ліку лаўрэатаў прэміі і настаяцель рэлігійнай абшчыны «Парафія Святой Тройцы ў вёсцы Росіца Верхнядзвінскага раёна мясцовага рэлігійнага аб'яднання «Віцебская дыяцэзія Рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі» Часлаў Курэчка, чый важкі ўклад у захаванне міжканфесійнага міру і нацыянальнай згоды, а таксама актыўны ўдзел у духоўна-асветнай дзейнасці краіны і прапагандзе здаровага ладу жыцця заслужылі шырокае прызнанне ў грамадстве.

Па выніках 2015 года прысуджаны таксама 10 спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Імі адзначаны дзеячы культуры і мастацтва, навукі, педагогі, аўтарскія калектывы, установы культуры за значныя дасягненні ў галіне выяўленчага і тэатральнага мастацтва, аматарскай творчасці, музейнай справы, выхавання моладзі.

Прэмія прысуджана аўтарскаму калектыву галоўнай дырэкцыі «Агенцтва тэлевізійных навін» Белтэлерадыёкампаніі ў складзе карэспандэнта спецыяльнага аддзела навін культуры Наталлі Бардзілоўскай, галоўнага рэжысёра Алега Даўгаполава і загадчыка аддзела навін культуры Міхаіла Равуцкага за стварэнне гісторыка-дакументальнага серыяла «Яны спявалі за Радзіму» і іншыя праекты, накіраваныя на патрыятычнае выхаванне моладзі.

Аўтарскі калектыў у складзе галоўнага навуковага супрацоўніка лабараторыі нелінейнай оптыкі Інстытута фізікі імя Б.І. Сцяпанава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Паўла Апанасевіча, першага намесніка генеральнага дырэктара ТАА «Магія святла» Сяргея Гінака, старшыні савета дырэктараў ЗАТ «Галаграфічная індустрыя» Леаніда Таніна ўзнагароджваецца прэміяй за значны ўклад у захаванне нацыянальных культурных традыцый і стварэнне візуальных вобразаў праваслаўных святынь з дапамогай галаграфічных тэхналогій.

Узнагароды ўдастоены аўтарскі калектыў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета ў складзе галоўнага мастака Аляксандра Касцючэнкі і галоўнага рэжысёра Міхаіла Панджавідзэ за значныя дасягненні ў развіцці сучаснага опернага мастацтва і пастаноўку спектакля «Царская нявеста».

Сярод узнагароджаных таксама выкладчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Антон Бельскі, які выканаў роспіс у храме Іаана Прадцечы Свята-Узнясенскага жаночага манастыра ў гарадскім пасёлку Баркалабава Быхаўскага раёна.

Прэміі ўдастоены калектыў Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М.Горкага, які ўнёс значны ўклад у захаванне нацыянальных культурных традыцый і стварыў на высокім мастацкім узроўні спектакль «Пясняр», прысвечаны творчай дзейнасці Уладзіміра Мулявіна.

Узнагародай адзначаны калектыў Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра, які дасягнуў высокіх творчых поспехаў і ўнёс важкі ўклад у развіццё і папулярызацыю тэатральнага мастацтва. Лаўрэатам прэміі стаў калектыў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны за значны ўклад у развіццё музейнай справы і патрыятычнае выхаванне насельніцтва.

У ліку ўзнагароджаных старшы выкладчык кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Канстанцін Касцючэнка, які стварыў манумент «Брама памяці» мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» і іншыя творы манументальнага мастацтва, а таксама член грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз мастакоў» Анатоль Кузняцоў, удастоены гэтай узнагароды за шматгадовую творчую дзейнасць і стварэнне высокамастацкіх твораў жывапісу.

Прэмія прысуджана і ўзорнаму ансамблю «Аношкаўская музыкі» Аношкаўскай дзіцячай школы мастацтваў Нясвіжскага раёна за мэтанакіраваную работу па захаванні нацыянальных мастацкіх традыцый і актыўную канцэртную дзейнасць.

Прыняцце ўказаў аб прысуджэнні прэмій з'яўляецца яркім сведчаннем пастаяннай увагі дзяржавы да пытанняў фарміравання ў беларускім грамадстве здаровай духоўнай атмасферы, развіцця беларускай культуры і мастацтва.

# СТАРТ ДАДЗЕНЫ!

**Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі набыў шырокую папулярнасць**

**Пра гэта заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы ўчора спаборніцтвы ў спартыўным комплексе «Чыжоўка-Арэна».**

Новы спартыўны год у Беларусі па добрай традыцыі стартуе з унікальных спаборніцтваў, лядовыя арэны сталіцы ў дванаццаты раз прымаюць удзельнікаў і балельшчыкаў Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея. «Гэтыя спаборніцтвы ўжо сталі своеасаблівай візітнай карткай нашай дзяржавы, набылі шырокую папулярнасць у многіх краінах, сталі неафіцыйным чэмпіянатам свету па хакеі сярод аматараў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

За галоўны трафей цяперашняга турніру будуць змагацца прадстаўнікі Беларусі, Германіі, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Расіі, Славакіі, Фінляндыі, Швейцарыі, Швецыі, паведамляе БЕЛТА. «Усе яны не пачаткоўцы і ўжо спрабавалі свае сілы на мінскім лёдзе. У складзе гэтых дружын знакамітыя гульцы, якія вызначыліся на спаборніцтвах самага высокага ўзроўню. І нам вельмі прыемна зноў прымаць іх у сябе ў гасцях», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Адметнай рысай беларускага турніру Прэзідэнт назваў сур'ёзны спартыўны складнік, дух сапраўднай барацьбы і самае важнае — перамножанасць прафесійнага і масавага спорту. «Галоўная мэта такіх аматарскіх матчаў — гэта перш за ўсё ўмацаванне дружалюбных адносін паміж краінамі-ўдзельніцамі. Бо, як вядома, спорт — лепшая форма народнай дыпламатыі!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Усіх нас аб'ядноўвае шчырая любоў да гэтага віду спорту, імкненне развіваць у сабе лепшыя якасці, уласцівыя яму, — мужнасць, стойкасць, мэтанакіраванасць. Нездарма ў народзе трывала замацаваўся крылаты выраз: баязлівец у хакей не гуляе», — заўважыў Прэзідэнт.

Калядны турнір адметны яшчэ і тым, што ў ім не бывае прайграўшых: выйграюць і ўдзельнікі, і заўзятары.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што цяперашнія спаборніцтвы стануць не толькі яркім і відовішчным святам, але і школай майстэрства для соцень юных спартсменаў. Кіраўнік дзяржавы ад усёй душы павіншаваў удзельнікаў турніру і заўзятараў з Новым годам і Калядамі.

■ Векапомнае

# ЖМЕНЬКА ПАМЯЦІ — ДЛЯ НАШЧАДКАЎ ПЕРАМОГІ

## Аўтары кнігі «Жыць і помніць», якая ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда», сталі лаўрэатамі прэміі «За духоўнае адраджэнне»

**Такую высокую ўзнагароду з рук Прэзідэнта Беларусі атрымаюць прафесар Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі, ваенны гісторык Анатоль ШАРКОЎ і журналіст, перакладчык Алена ХАРАШЭВІЧ. У год 70-й гадавіны Вялікай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне аўтарскія калектыў ажыццявіў надзвычай адказную місію: наведаўшы пахаванні савецкіх салдат сямі еўрапейскіх краін, прывёз зямлю для крыпты храма-помніка ў гонар Усіх Святых.**


Фота Надзеі БУЖАН.
Вось у такіх сасудах у крыпце храма-помніка захоўваецца зямля.

Нагадаем, першыя капсулы былі закладзены Аляксандрам Лукашэнкам 2 кастрычніка ў рамках акцыі «Малітва за Беларусь». Ва ўрачыстай цырымоніі ўдзельнічалі кіраўнікі праваслаўнай, каталіцкай, мусульманскай і іудзейскай рэлігійных канфесій, дыпламатычных прадстаўніцтваў сямі дзяржаў, адкуль была прывезена зямля: Германіі, Аўстрыі, Польшчы, Чэхіі, Венгрыі, Славакіі і Італіі. 39 прыгожых сасудаў, якія асвяціў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, запоўнілі нішы крыпты ў праваслаўнага свята Пакроў Прасвятой Багародзіцы.

Усё гэта стала магчымым дзякуючы ўнікальнаму праекту, ажыццёўленаму пад эгідай Усіхсвяцкага прыхода Мінска з благаслаўлення яго настаяцеля протаіерэя Фёдара Поўнага. Аб воінах, нашых суайчынніках, якія загінулі па-за межамі Беларусі падчас Другой сусветнай вайны, а таксама месцах, дзе яны засталіся назаўсёды, вельмі падрабязна расказваецца ў кнізе «Жыць і помніць», падрыхтаванай Выдавецкім домам «Звязда».

Памяць аб Вялікай Айчыннай вайне ў нас, беларусаў, закладзена на генетычным узроўні. Ужо радзеюць рады пераможцаў, а памяць мацнее — такі маральны абавязак нашчадкаў.

— Некаторыя зацікаўлены ў тым, каб мы хутчэй забыліся пра жудаснае мінулае, якое вогненным смерчам пранеслася па нашай краіне, — перакананы Анатоль Шаркоў. — Але гэтага не будзе ніколі. Пасля таго, як кніга выйшла ў свет, ва Усіхсвяцкі прыход, пад эгідай якога ствараўся праект, пачалі дасылаць лісты. Людзі звяртаюцца з просьбамі дапамагчы ім знайсці загінулых за мяжой сваякоў, канкрэтныя пахаванні, просяць прывезці зямлю адтуль, дзе мы яшчэ не былі, каб і ў іх з'явілася магчымасць дакрануцца да гэтых святых месцаў. Шырокі рэзананс праект атрымаў не толькі сярод беларусаў. Асаблівую цікавасць наша справа выклікала з боку Расійскай Федэрацыі. Хочацца верыць, што кніга памяці будзе садзейнічаць і супрацоўніцтву паміж краінамі некалі ваюючых бакоў.

Пра Другую сусветную аўтары кнігі-рэквіема ведаюць не па чутках. Анатоль Шаркоў вырас на бацькавых аповедах пра вайну. Васіль Антонавіч прайшоў вайну з першага па апошні дзень. На фронце ваявалі яго браты. Адзін не вярнуўся. І дагэтуль сваякі не ведаюць, як склаўся яго лёс. У тых краях, дзе партызаніў бацька, народным мсціўцам дапамагаў дзядуля Анатоля Васільевіча па матчынай лініі. Незадоўга да вызвалення Беларусі яго забралі ў турму ў Крупках, дзе разам з іншымі спалілі. У сям'і Алены Харашэвіч пра вайну гаварыць не любілі. Яе дзядуля па матчынай лініі дайшоў да Польшчы, а бацькаў тата не вярнуўся: у першыя дні вайны застаўся без вачэй. Ён ніколі не бачыў сваю ўнучку, мог не толькі адчуваць...

Затое іх — сваіх герояў — памятаюць яны. А колькі такіх, хто ніколі так і не ўбачыў сваіх бацькоў, дзядоў і прадзедаў. Толькі на палях Еўропы, ажыццяўляючы вызваленчую місію, загінула звыш мільёна савецкіх воінаў. Іх пахаванні і нават цэлыя магілкі герояў рассеяны ад Буга да Берліна. Недалёка ад Радзімы спачывае і нямала беларусаў.

Каб пакланіцца іх магілам, аўтарам кнігі давялося пераадолець не адну тысячу кіламетраў. Але адна справа — дабрацца, іншая — знайсці. Дапамагалі асабістыя напрацоўкі, архіўныя звесткі і проста добрыя, неабыякавыя да ўвекавечвання памяці людзі. Так сасуды паступова напаўняліся зямлёй, сабранай са знакавых мемарыялаў, брацкіх магіл, змешаных могілак і асобных, нават змешчаных дзесьці наводшыбе пахаванняў, пазначаных беларускімі імёнамі.

— У гэтых краінах мы хацелі не проста пабываць на месцах баёў і пахаванняў, прывезці адтуль зямлю, але і паглядзець, што робіцца там у справе ўвекавечвання памяці, — гаворыць Анатоль Шаркоў. — Прычым мы наведалі памятныя месцы, дзе прадстаўлены ўсе катэгорыі ахвяр той вайны: забітыя ў баях ваеннаслужачыя, ваеннапалонныя, якіх знішчылі ў фашысцкіх канцлагерах, прымусова прыгнаныя савецкія грамадзяне, якія памерлі ад непасільнай працы, малалетнія вязні.

«Вельмі ўразіла брацкая магіла ў Дрэздэне, у якой спачываюць польскія і савецкія дзеці, — прызнаецца Алена Харашэвіч. — У берлінскім раёне Тэгель знаходзяцца рускія могілкі, дзе сярод пахаванняў першай міграцыі, савецкіх вайскоўцаў, якія загінулі падчас Другой сусветнай вайны, таксама ёсць дзіцячая брацкая магіла».

На жаль, не ўсе нашы суайчыннікі, якія паляглі за мяжой, увекавечаны паіменна. Не раз на гранітных плітах аўтарам даводзілася чытаць: беларус, з Навагрудка... Але ў той жа час паіменна вядомы ўсе выхадцы з Беларусі, якія загінулі ў бітве пад Монтэ-Касіна, што доўжылася 123 дні. На полі боя палеглі 924 салдаты корпуса Андэрса, у тым ліку 180 беларусаў. Імёны ўсіх — у кнізе.

Сучаснае пакаленне беларусаў пазнае сярод іх сваіх продкаў. Многія і хацелі б дабрацца да патрэбных магіл, толькі не ўсім гэта па сілах. Але кожны можа прыйсці ў храм-помнік і пакланіцца сваім салдатам Перамогі. А неўзабаве такая магчымасць з'явіцца яшчэ ў большай колькасці людзей, жменьку памяці для якіх з іншых краін, дзе спачываюць воіны-беларусы, прывязуць сённяшнія лаўрэаты.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

## На лёдзе «Чыжоўка-Арэны» змагаюцца 8 дружын

**Першыя дні новага года і першыя спартыўныя спаборніцтвы. Па традыцыі ў гэты час наша сталіца прымае XII Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі.**



Гуляюць каманды Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў і Славакіі.

Фота БЕЛТА.

У гэтым годзе на лёдзе «Чыжоўка-Арэны» змагаюцца 8 дружын, у складзе каманд легенды сусветнага хакея, прызёры Алімпійскіх гульняў і чэмпіянатаў свету. Беларусь на турніры прадстаўляе каманда Прэзідэнта краіны.

Што тычыцца замежных удзельнікаў, то большасць з іх прыбыла загадзя. Госці з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў яшчэ ў мінулым годзе былі дэбютантамі турніру, а сёння ўжо як роўныя змагаюцца за перамогу і прывозяць у Мінск усё больш моладзі, каб развіваць хакей і ў сваёй краіне. Спартсменаў з ААЭ не палохае ні мароз, ні гучныя імёны калег з іншых дружын.

*— Розніца тэмператур паміж нашымі краінамі складае зараз 40 градусаў. У нас цёпла, у вас холадна і снежна, але, нягледзячы на гэта, усё цудоўна,* — дзеліцца ўражаннямі **гулец каманды Махамед Аль Забі.**

Госці адзначаюць, што гэты турнір з'яўляецца вельмі важным для іх, дапамагае набрацца вопыту і перадаваць яго далей у такой экзатычнай для хакея краіне. Акрамя гэтага, яны адзначаюць і вельмі ўдалае месца правядзення спаборніцтваў і не хаваюць, што сочаць за развіццём спорту ў Беларусі.

*— Гэта вельмі прыгожая краіна, прыгожы горад! Мы праехалі па ім, паглядзелі, і цяпер я магу сказаць: я люблю Мінск. Яшчэ на мінулым турніры мы сталі сведкамі зусім іншага ўзроўню хакея і былі вымушаны рыхтавацца да гэтага года, каб адпавядаць узроўню каманд,* — распавядае **Мухамед Аль Каабі**, на якім надзета, дарэчы, джэрсі хакеіста мінскага «Дынама» Джонатана Чычу.

Куды больш вопыту ў нашых гасцей са Славакіі, хакеісты з гэтай краіны прыязджаюць не толькі змагацца за перамогу, але і проста прыемна правесці час.

*— Мы прыязджаем сюды ўжо традыцыйна і будзем не толькі спаборнічаць, але і адпачываць, гуляць па горадзе, таму што ў вас незвычайная сталіца. Мінск мне вельмі падабаецца,* — адзначае **Ладзіслаў Шыл, гулец каманды Славакіі.**

Галоўнымі фаварытамі турніру з'яўляюцца зборныя Беларусі і Расіі, і гэта чакана, бо менавіта яны раней станавіліся пераможцамі спаборніцтваў. На рахунку нашых суайчыннікаў восем перамог, у актыве суседзяў — тры вікторыі.

У складзе беларускай каманды на лёд выходзяць хакеісты, якія ўжо ўпісалі свае імёны ў спартыўную гісторыю краіны, сярод іх Сяргей Шабанаў, Уладзімір Цыплакоў, Алег Антоненка, Алег Мікульчык і іншыя. Гэта прыцягвае на трыбуны не толькі маладых актыўных аматараў спорту, але і балельшчыкаў са стажам. Дарэчы, уваход на ўсе матчы турніру свабодны.

Нагадаем, наперадзе яшчэ тры спаборніцкія дні. Сёння і заўтра каманды працягнуць гуляць у сваіх квартэтах, пасля чаго тры дружыны, якія занялі другія месцы ў групах, сустрэнуцца ў матчы за бронзавыя ўзнагароды, а пераможцы будуць змагацца ў фінальным паядынку.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Афіцыйна

# НОВЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ПЕНСІІ

## Беларусам трэба будзе зарабляць большы стаж, а замежнікам — страхавацца

**Са студзеня, згодна з указам Прэзідэнта №534, мінімальны працоўны стаж для атрымання пенсіі будзе складаць 15 гадоў 6 месяцаў. А пачынаючы з 2017-га, патрабаванні па стажы штогод паступова будуць павялічвацца на паўгода, пакуль не дасягнуць 20 гадоў.**

Крытэрыі для налічэння пенсіі па інваліднасці і пры страце карміцеля застаюцца ранейшымі. Павелічэнне стажу не закранае і сацыяльна ўразлівыя катэгорыі, якім сфарміраваць доўгі стаж аб'ектыўна цяжка (бацькоў дзяцей-інвалідаў, шматдзетных маці, інвалідаў з дзяцінства). Каб прэтэндаваць на датэрміновую пенсію, ім дастаткова адпрацаваць пяць гадоў з выплатай страхавых узносаў.

Указ таксама прадугледжвае, што пераразлік пенсій у сувязі з ростам сярэдняга заробку ў краіне будзе праводзіцца не радзей за раз на год у межах сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацабароны.

Замежнікам і асобам без грамадзянства, якія ў нас працуюць ці з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, цяпер неабходна выплачваць абавязковыя дзяржаўныя страхавыя ўзносы на ўмовах, устаноўленых заканадаўствам для грамадзян Беларусі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Дзяржаўны клопат

# ЧАТЫРЫ ТЫСЯЧЫ Ў ГАДЗІНУ

## каштуюць у сярэднім сацыяльныя паслугі

**Самай папулярнай сацпаслугай у насельніцтва з'яўляецца дапамога дома. Паводле слоў <u>намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандра РУМАКА</u>, ёй карыстаецца 88 тысяч грамадзян. «Перыядычнасць наведвання залежыць ад фізічнага стану чалавека і вызначаецца камісіяй цэнтра. Максімум можа быць пяць візітаў сацработніка на тыдзень», — кажа Аляксандр Румак.**

Адзінокім пажылым паслугі аказваюцца бясплатна. Для тых жа, хто мае працаздольных дзяцей, устаноўлены пагадзінны тарыф. Алё ён невялікі — ад 3,5 да 5 тысяч рублёў у залежнасці ад рэгіёна. У міністэрстве падкрэсліваюць, што з такімі расцэнкамі, якія захоўваюцца ўжо на працягу доўгага часу, паслугі застаюцца даступнымі для ўсіх. Гадзінныя тарыфы ўстанаўліваюцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам на ўзроўні, значна ніжэйшым за сабекошт (у сярэднім 18 працэнтаў). Сёння візіты сацработніка аплачваюць 97,4 працэнта тых, хто абслугоўваецца дома.

— У краіне працуюць 146 тэрытарыяльных цэнтраў, — прыводзіць лічбы намеснік міністра. — Сістэма наладжана так, каб задаволіць попыт у сацыяльных паслугах усіх пажылых людзей, якія маюць у гэтым патрэбу, незалежна ад таго, дзе яны пражываюць. Хаця гэта зрабіць вельмі не проста. Уяўляеце, калі ў раёне больш за 400 населеных пунктаў, як, напрыклад, у Вілейскім, і нават у такое надвор'е, як цяпер, сацыяльнаму работніку трэба дабрацца да пажылога чалавека?

Каб пашырыць рынак сацпаслуг, Мінпрацы развівае дзяржаўны сацыяльны заказ. Некамерцыйныя арганізацыі на ўмовах конкурсу атрымліваюць фінансаванне з мясцовага бюджэту на аказанне паслуг. Сёння ў краіне рэалізуецца 78 такіх дагавораў. Большасць з іх заключаны з Беларускім Чырвоным Крыжам.

— Гэтая арганізацыя мае вельмі вялікі вопыт і падрыхтаваныя кваліфікаваныя кадры з ліку сёстраў міласэрнасці. Яны гатовы прыйсці на дапамогу тым людзям, у якіх ёсць захворванні, што з'яўляюцца супрацьпаказаннямі для аказання паслуг тэрытарыяльнымі цэнтрамі, — каментуе Аляксандр Румак. — Але дагаворы падпісаны не толькі з Чырвоным Крыжам. Ёсць дамоўленасць і з прыходамі беларускай праваслаўнай і рымска-каталіцкай царкваў, і з грамадскімі арганізацыямі. Мы разлічваем, што апошнія будуць больш актыўнымі. Заклікаем іх ісці на рынак сацыяльных паслуг, каб яны не толькі выступалі з парадамі і рэкамендацыямі, але і на практыцы рэалізоўвалі іх.

Сёння ў краіне адзначаецца Дзень работнікаў сацыяльнай абароны. Прафесійнае свята для 37,6 тысячы чалавек. Паводле слоў першага намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэя ЛАБОВІЧА, гэтыя спецыялісты выконваюць шмат адказных задач. Сярод іх — каардынацыя і выкананне дзяржаўных праграм, работа па ўдасканаленні заканадаўства ў галіне занятасці насельніцтва, аховы працы, дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, пенсійнага забеспячэння.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

**P.S.** *Звяздоўцы шчыра віншуюць усіх работнікаў сацыяльнай абароны з прафесійным святам!*

■ Таленты

# НАШЧАДКІ КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА

**70 заявак было пададзена на абласны конкурс «Літаратурная прэмія імя Кірылы Тураўскага». Ён заснаваны Гомельскім аблвыканкамам, абласным Саветам дэпутатаў і мясцовым аддзяленнем грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі». У Гомелі падвялі вынікі і ў трэці раз уручылі літаратурную прэмію імя Кірылы Тураўскага.**

У шасці намінацыях конкурсная камісія адбірала творы, якія будуць цікавыя шырокаму колу чытачоў. «Адкрыццём года» названа сям'я гамяльчан ШАСТАКОВЫХ за серыю нарысаў пра родны край. Найлепшым паэтам года стала гамяльчанка Ніна НІКІЦІНА. У намінацыі «Дзіцячая літаратура» прэмія прысуджана Веры КВЯТКОЎСКАЙ за зборнік дзіцячых вершаў. Найлепшым празаікам прызнаны Міхась КАВАЛЁЎ з Рагачова (вядомы пад псеўданімам Міхась Сліва). У намінацыі «Драматургія» перамог акцёр і рэжысёр Гомельскага абласнога драматычнага тэатра Аляксей БЫЧКОЎ. Без пераможцы засталася намінацыя «Публіцыстыка і літаратурная крытыка».

Пераможцы атрымалі дыпломы і грашовыя ўзнагароды, аднак галоўнай узнагародай стала выданне іх твораў пры падтрымцы аблвыканкама. **Намеснік старшыні Уладзімір ПРЫВАЛАЎ** падкрэсліў, што папулярнасць конкурсу штогод павышаецца:

— Гомельская зямля заўсёды славілася літаратурнымі талентамі. Такіх пісьменнікаў, як Мележ, Шамякін, Макаёнак, Навуменка, ведаюць далёка за межамі Беларусі. Літаратурныя традыцыі класікаў захоўваюцца і сёння. А Гомельскі аблвыканкам заўсёды падтрымліваў і будзе падтрымліваць таленавітых людзей.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Літаратурнае пабрацімства

# Беларускі нумар часопіса «Каракум»

## Беларуска-туркменскія літаратурныя стасункі папоўніліся яшчэ адной старонкай

**У Ашхабадзе ў часопісе «Каракум» (жнівеньскі нумар за 2015 год) надрукавана падборка твораў пісьменнікаў Беларусі.**

Адкрываецца яна артыкулам пра перакладчыцкую работу Міколы Чарняўскага па прадстаўленні ў Беларусі дзіцячай паэзіі Туркменістана. Варта нагадаць, што ён даўно і ўважліва пераўвасабляе туркменскую паэзію, адрасаваную юнаму чытачу, на беларускую мову. Пад увагай беларускага перакладчыка — творы Азата Рахманава, Пірнепеса Авезліева, Акджэмал Амаравай і інш.

Адказны сакратар часопіса «Каракум» Бягуль Анабаева пераклала апавяданне Алеся Бадака «Ідэальны чытач». Яна ж і перакладчыца апавядання «Падарунак» Анастасіі Кузьмічовай, якая жыве і працуе ў Мінску і піша прозу на рускай мове. Між іншым, змест апавядання «Ідэальны чытач» Алеся Бадака самым цесным чынам звязаны з Ашхабадам, Туркменістанам.

Варта зазначыць, што часопіс, які сёння выходзіць у нейтральным Туркменістане, — праваперыемнік колішняга літаратурна-мастацкага выдання «Савет эдэбіяты» («Савецкая літаратура»), вытокі якога адносяцца да 1928 года. Сярод беларускіх аўтараў часопіса, якія выступалі са сваімі творамі на яго старонках у ранейшыя дзесяцігоддзі, — Якуб Колас, Янка Купала, Алесь Адамовіч, Мікола Калінковіч, Міхась Карпенка і шмат хто яшчэ.

**Сяргей ШЫЧКО**

■ Надвор'е

# ТЫДЗЕНЬ СУР'ЁЗНЫХ ХАЛАДОЎ

## А ўначы на чацвер і пятніцу сіноптыкі чакаюць маразы да мінус 25 градусаў

**Практычна ўвесь тыдзень на тэрыторыі краіны захаваецца марознае і спакойнае надвор'е, пра што паведаміў <u>начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.</u>**



Увесь гэты час у нас будзе гаспадарыць зона паніжанага атмасфернага ціску, якая сфарміравана ў халоднай паветранай масе. У аўторак месцамі пройдзе невялікі снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе ад мінус 8 да мінус 14 градусаў, у асобных раёнах — 15-17 марозу. І ў сераду месцамі пройдзе невялікі кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 13-20 градусаў, пры праясненнях чакаецца да мінус 21 да мінус 23 градусаў, а ўдзень будзе 8-14 марозу, месцамі — да мінус 17.

Даволі марозна будзе і на Каляды, пераважна без ападкаў, толькі па поўдні пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 13-20 градусаў, а па поўначы месцамі чакаецца да 21-25 марозу, удзень — мінус 10-17 градусаў. Крыху цяплей будзе ў паўднёвых раёнах: уначы — 7-12 марозу, а ўдзень — мінус 4-9 градусаў. Невялікі кароткачасовы снег пройдзе месцамі ў пятніцу, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 15-21 градус, пры праясненнях — да мінус 22-25 градусаў. Удзень чакаецца 6-12 марозу, месцамі — да мінус 15 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, пачынаючы з суботы з боку Заходняй Еўропы да нас пачне паступаць больш цёплае паветра і маразы будуць слабець.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Ірына ПЯТКУН:

# «ГЕНДАРНАЯ РОЎНАСЦЬ — НАТУРАЛЬНАЯ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ»

**Жанчынай на кіруючай пасадзе ў Беларусі зараз нікога не здзівіш. Ні на прадпрыемстве, ні ў палітыцы. Мы нават пра гэта не задумваемся, бо ўспрымаем як данасць. А ў суседняй Еўропе, напрыклад, жанчыны адстойваюць права займаць месца ў парламенце. Для гэтага ўводзяцца спецыяльныя квоты, прымаюцца законы...**
**Да такіх высноў прыйшла Ірына Пяткун, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, дырэктар Рэчыцкага раённага ліцэя, пасля наведвання мерапрыемства ў Сербіі. Яго ў рамках міжнароднага праекта, прысвечанага ўдзелу жанчын у кіраванні дзяржавай, арганізавалі Міністэрства замежных спраў Беларусі і Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ). Спецыяльна для «Звязды» сенатар параўнала стан правоў жанчын у Беларусі і замежжы і ацаніла, як іх захоўваюць у нашай краіне.**

**— Наколькі актуальна сёння пытанне гендарнай роўнасці для Беларусі?**

— Паляпшэнне становішча жанчын у соцыуме і забеспячэнне гендарнай роўнасці — адзін з найважнейшых кірункаў развіцця ўсяго грамадства ў сучасным свеце. Кожная краіна сама выбірае, як рухацца ў гэтым рэчышчы з улікам уласных гістарычных асаблівасцей і ўзроўню развіцця. У многіх дзяржавах гэты працэс пачаўся даўно, і там назапашаны значны вопыт па пытаннях гендарнай роўнасці, які нам, як маладой дзяржаве, варта пераняць. З мэтай вывучэння такога вопыту і была арганізавана паездка ў Сербію беларускай дэлегацыі, якую я ўзначаліла.

**— Ці не падаецца вам, што гэтай тэме часам надаецца занадта вялікае значэнне?**

— Ні ў якім разе. У Сербіі жанчынам даводзіцца змагацца за аднолькавыя правы з мужчынамі. У вас узнікае пытанне такога кшталту толькі таму, што ў Беларусі гендарная роўнасць захоўваецца неяк натуральна. Ёсць шмат нормаў, якія для беларусаў звыклыя. Напрыклад, тое, што жанчыны і мужчыны могуць свабодна выбіраць і быць абранымі, маюць права роўнага доступу да любых пасад у дзяржаўных органах, права на выбар прафесіі, роду заняткаў і работы, а таксама права на роўнае ўзнагароджанне за працу аднолькавай каштоўнасці, права на адукацыю і на сацыяльнае забеспячэнне ў старасці. У сферы сямейных адносін жонка і муж таксама цалкам раўнапраўныя. Гэтая традыцыя ў нашага народа існуе спрадвеку. У беларускай мове нават на ўзроўні маўлення заўжды захоўвалася роўнасць паміж мужам і жонкай. Мы кажам «ажаніцца з кімсьці», а не «на кімсьці», значыць, па роўнай згодзе абаіх.

**— Вы ўжо згадалі яшчэ адзін важны паказчык роўнасці — узровень заработнай платы. Наколькі ён захоўваецца ў нас?**

— Што тычыцца сярэдняй зарплаты, то ў гэтым ні адна краіна свету пакуль не дасягнула гендарнай роўнасці. Напрыклад, у Беларусі сярэдняя зарплата жанчын на 33% меншая, чым у мужчын. Гэта тлумачыцца большай колькасцю працаўнікоў-мужчын у прамысловасці, будаўніцтве, цяжкім машынабудаванні, дзе шкодныя і небяспечныя ўмовы, высокая напружанасць працы і таму большая зарплата. Розніца ў аплаце працы ў хімічнай вытворчасці складае 40,1%, а ў сферы абслугоўвання і гандлю заработная плата жанчын вышэйшая, чым у мужчын, на 12,8%.

Аднак беларускі паказчык у параўнанні, напрыклад, з еўрапейскімі, адзін з найлепшых. Вясной гэтага года ААН апублікавала даклад аб няроўнасці заробкаў мужчын і жанчын у свеце. Згодна з ім, у сярэднім зарплата жанчын адстае ад мужчынскай на 23%. Ва Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі жанчыны атрымліваюць за сваю працу на 22 працэнты менш за мужчын, у Францыі і Швецыі — на 31, у Германіі — на 49, у Турцыі — на 75. Таму Беларусь з паказчыкам у 33% выглядае даволі паспяховай.

**— А што тычыцца захоўвання правоў у сферы працы?**

— Яны замацаваны ў Працоўным кодэксе Беларусі. Напрыклад, з 2007 года гэтым дакументам уводзіцца права маці, якая выхоўвае траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў або дзіця-інваліда да 18 гадоў, на адзін аплачаны свабодны ад працы дзень у тыдзень. Гэта распаўсюджваецца і на тату. Бацькі гэтыя дні могуць і падзяліць. А жанчыны, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, могуць прыцягвацца да працы ў начны час толькі з іх пісьмовай згоды.

**У сярэднім зарплата жанчын адстае ад мужчынскай на 23%. Ва Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі жанчыны атрымліваюць за сваю працу на 22 працэнты менш за мужчын, у Францыі і Швецыі — на 31, у Германіі — на 49, у Турцыі — на 75. Таму Беларусь з паказчыкам у 33% выглядае даволі паспяховай.**

**— Што яшчэ можа паказваць на гендарную роўнасць ці яе адсутнасць?**

— Занятасць жанчын. Адной з уласцівасцей нашай краіны з'яўляецца яе высокі паказчык — 52,1%. Сярод занятых у эканоміцы доля працуючых жанчын з вышэйшай адукацыяй складае 33,9%, у той час гэты ж паказчык сярод мужчын — 24,4%. Сярод дзяржаўных служачых жанчыны складаюць 68,5%. У найвышэйшых органах заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады доля жанчын таксама большая — 55,4%. Сярод прафесарска-выкладчыцкага складу ўстаноў вышэйшай адукацыі — 55,7% жанчын, ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі гэтая лічба яшчэ большая.



**— А калі сказаць пра палітычную арэну, колькі жанчын у беларускім парламенце?**

— У складзе Нацыянальнага сходу практычна дасягнута дэкларуемае міжнароднымі дакументамі 30-працэнтнае прадстаўніцтва жанчын. У нашым парламенце іх 29,7%. А на апошнім пасяджэнні Нацыянальнага савета па гендарнай палітыцы пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь было адзначана, што Беларусь — адна з нешматлікіх краін, дзе ўзровень удзелу жанчын у складзе мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў перавышае ўзровень удзелу мужчын — 62,7%.

**— Самі парламентарыі гэтаму таксама паспрыялі?**

— Не толькі гэтаму, але і ўвогуле захоўванню роўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі. Толькі на працягу апошніх гадоў парламентам прыняты шэраг заканадаўчых актаў у сферы аховы мацярынства, бацькоўства і дзяцінства, недапушчэння дыскрымінацыі пры працаўладкаванні, звальненні, прафесійным прасоўванні, прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын, гвалту ў сям'і і інш. Дарэчы, у 2013 годзе ў Беларусі праведзена ўсеабдымная гендарная экспертыза нацыянальнага заканадаўства, якая не выявіла наяўнасці дыскрымінацыйных прававых нормаў у адносінах да жанчын.

Што тычыцца ўдзелу дзяржавы, то ў Беларусі дзейнічае Нацыянальны савет па гендарнай палітыцы. Ён сочыць за недапушчэннем праяў дыскрымінацыі па прыкмеце полу і імкнецца ствараць для гэтага спрыяльныя ўмовы. Таксама ў гэтым годзе завяршаецца рэалізацыя чацвёртага «Нацыянальнага плана дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці ў Рэспубліцы Беларусь на 2011-2015 гады». Ужо выкананы практычна ўсе яго мерапрыемствы. Але для таго, каб ацаніць і прааналізаваць работу ў гэтым напрамку і яе вынікі, неабходна пастаянна вывучаць вопыт нашых замежных калег. Бо ўсё пазнаецца ў параўнанні.

**— У парламенце Сербіі такая ж высокая колькасць жанчын?**

— Так. У Сербіі жанчыны займаюць важныя пасады ў грамадстве і ўдзельнічаюць у прыняцці і правядзенні важных палітычных рашэнняў. У выніку палітычнай барацьбы яны дамагліся, каб кожная трэцяя ў партыйных спісах кандыдатаў на парламенцкіх выбарах была жанчына. У 2012-м нават быў прыняты адпаведны закон.

**Ёсць шмат нормаў, якія для беларусаў звыклыя. Напрыклад, тое, што жанчыны і мужчыны могуць свабодна выбіраць і быць абранымі. У сферы сямейных адносін жонка і муж таксама цалкам раўнапраўныя. Гэтая традыцыя ў нашага народа існуе спрадвеку.**

**— Што з вопыту захавання гендарнай роўнасці ў Сербіі можа запазычыць Беларусь і наадварот?**

— У Сербіі існуе Парламенцкая сетка жанчын. Сустрэча з яе прадстаўнікамі была карыснай у плане вывучэння вопыту жанчын-дэпутатаў ва ўзмацненні ролі жанчын як на палітычнай арэне, так і ў ліквідацыі гендарнай няроўнасці, развіцці жаночага грамадскага руху. У сваю чаргу дэлегацыя Рэспублікі Беларусь падзялілася вопытам ліквідацыі гендарнай няроўнасці ў нашай краіне. Асаблівую цікавасць у сербскага боку выклікаў дастаткова высокі працэнт жанчын у парламенце Беларусі без наяўнасці закона аб гендарнай роўнасці і кватаванні месцаў у ім.

У рамках візіту мы таксама сустрэліся з незалежным экспертам Аляксандрай Уладзісаўлевіч, якая расказала пра вопыт Сербіі ў правядзенні штогадовай гендарнай экспертызы бюджэту краіны. Рэалізацыя папраўак у бюджэтаванні праводзіцца праз Парламенцкую сетку жанчын і Міністэрства фінансаў.

Таксама дэлегацыя Беларусі наведала ўрад Сербіі. Падчас сустрэчы былі абмеркаваны пытанні гендарнай экспертызы нацыянальных заканадаўстваў. Сербскія калегі не раз чулі пра поспехі ў гендарнай палітыцы нашай краіны і з цікавасцю даведаліся пра вопыт Беларусі ў яе рэалізацыі.

**— Чым карысны быў візіт?**

— Удзел беларускай дэлегацыі ў ім апраўданы. Прынцыпова важнае значэнне наша дэлегацыя надавала наладжванню двухбаковых кантактаў з парламентарыямі Сербіі, паглыбленню эканамічных сувязяў з нашай краінай. Узаемадзеянне з парламентарыямі іншых дзяржаў стварае спрыяльныя ўмовы для падтрымання і развіцця міжпарламенцкіх кантактаў, для давядзення да замежных калег аб'ектыўнай інфармацыі пра сітуацыю ў нашай краіне, распаўсюджвання ідэй і вопыту Беларусі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ЦЁПЛЫЯ КРОКІ

**Валёнкі сталі своеасаблівым дэпутацкім «брэндам». Іх чацвёрты год запар напярэдадні навагодніх свят дорыць вясковым старажылам Дзяржынскай выбарчай акругі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіслаў ЦЫДЗІК.**

— З валёнкамі вы нам і зіму прывезлі, — сустракаюць гасцей ля варот свайго дома баба Шура і дзед Франц Доўнары. Жывуць яны ў вёсцы Старына Дзяржынскага раёна. Выйшлі падзівіцца доўгачаканаму беламу покрыву, а тут — на парозе госці, ды яшчэ з сюрпрызам. Валёнкі заўсёды на вёсцы былі ў пашане. Цяпер шапавалы робяць іх асабліва цёплымі і прыгожымі. Нярэдка, гледзячы на абноўкі, старыя ўспамінаюць маладыя гады. «Вось бы такую прыгажосць на той час. Ад кавалераў адбою не было б», — часам жартуюць бабулі.

Ала Губарэвіч, старшыня Дзяржынскай пярвічнай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым сем'ям», дэпутат мясцовага Савета, добра ведае ўсю акругу і яе жыхароў. Таму Ала Браніславаўна і прапануе зазірнуць у хаты тых людзей, якім дапамога асабліва патрэбна. Яна прыдумала і наступныя прывітальныя словы: «З цяплом і радасцю ідзём. Валёнкі файныя нясём».

Чарговы прыпынак — вёска Мелькавічы, дзе жыве Аляксей Пятровіч Гаркач, былы чыгуначнік. Хату напаўняе вясёлая гамонка, прымяраюцца валёнкі. Ад амаль дзевяностагадовага ўсхваляванага гаспадара гучаць словы вялікай удзячнасці.

Вёска Пажэжына. Стукаем у дзверы Ніны Сцяпанаўны Гарбуз. Ведаем, чакае і Леакадзія Антонаўна Носікава. Дэпутат, перш чым уручыць падарунак, цікавіцца лёсам жанчын, іх сённяшнімі патрэбамі. Кожная амаль сорак гадоў спраўна працавала ў калгасе. Родная зямля і зараз надае доўгажыхаркам сілы. Яны кажуць, што ніколі не мелі зайздрасці, не растрачвалі сябе марна. З прыездам гасцей засвяціліся ў іх вачах агеньчыкі радасці. Валёнкі, як навагодняя ёлка, заззялі ў хатах святлом людскога цяпла.

Уладзіслаў Цыдзік мае ўжо 85 вось такіх незабыўных навагодніх сустрэч. Гэта не проста падарунак ад дэпутата. Гэта цёплыя крокі ад душы да душы.

— Радуе, што ў сваім намеры несці дабро я не адзінокі, — гаворыць Уладзіслаў Станіслававіч. — Дапамаглі набыць валёнкі кіраўнікі дзяржынскага прадпрыемства «Араматык». І было яшчэ шмат неабыякавых людзей, з якімі на працягу года ў Дзяржынскім і Уздзенскім раёнах удалося зрабіць многа карыснага.



Дэпутат дадае:

— Калі гарады патонуць у свеце феерычных агнёў, а на святочным стале не будзе месца для новых пачастункаў, успомніце пра тое, што недзе ў аддаленай вёсцы да цёплай печкі туліцца старая бабуля і яна таксама загадвае свае жаданні...

**Алена СТЭЛЬМАХ.**
**Фота аўтара.**

■ Святло ў акне

# МАМА І ЦЕШЧА — У АДНОЙ АСОБЕ

## У Клічаве выхаванцы прыёмнай сям'і самі сталі бацькамі для сацыяльна не абароненых дзяцей

**Вось што значыць добры прыклад для пераймання. Да нядаўняга часу ў раёне існаваў дзіцячы дом сямейнага тыпу Маргарыты і Сяргея Кундзікавых, а зараз па іх слядах пайшлі дзеці — родны сын Захар і прыёмная дачка Юля. Маладыя людзі і сваю сям'ю стварылі з такім намерам, каб падарыць шчасце абяздоленым дзецям. У раёне, калі будавалі чарговы дом для прыёмных дзяцей, нават не сумняваліся, хто стане ў ім гаспадарыць. Пакуль там ішлі апошнія падрыхтоўкі, карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з выхавацелямі-пачаткоўцамі ў доме іх бацькоў. Як пажартаваў Захар, цяпер маці для яго і цешча, і калега, і галоўны кансультант.**

Праз дзіцячы дом Маргарыты і Сяргея Кундзікавых за 25 гадоў яго існавання прайшлі 43 выхаванцы. Большасць з іх застаецца на сувязі і сёння. Дастаткова пагартаць Кнігу жыцця вялікага сямейства, каб пагладзець, як склаўся іх лёс. Некаторыя ўжо самі сталі бацькамі, але пра свой дом не забываюць. Сябруюць і ездзяць у госці адно да аднаго. Калі летась Захар і Юля ўзялі з прытулку двух першых дзяцей, дапамагалі, хто чым мог: мэбляй, дыванамі, адзеннем.

Маргарыта Кундзікава ганарыцца, што лёс яе выхаванцаў складваецца ўдала. Асабліва радуецца за прыёмных дачок, якія паспяхова выйшлі замуж. Заадно выхавала нявестак — не толькі для сябе, але і для сваёй роднай сястры: пляменнік тут таксама знайшоў сабе другую «палову».

Шмат хто з дзяцей марыў пра вялікія сем'і, але не ва ўсіх атрымалася іх стварыць. Захар жа, можна казаць, з дзяцінства ішоў да гэтай мэты. Яму было ўсяго 6 гадоў, калі ў яго жыцці з'явіліся першыя прыёмныя сёстры і браты. Але тое, што яго абранніцай будзе таксама дзяўчына з іх сям'і, стала сюрпрызам для ўсіх. На той час, калі бацькі забралі з прытулку Юлю з яе малодшым братам, Захар быў ужо самастойным маладым чалавекам і жыў асобна. І зусім не думаў убачыць у сціплай 10-гадовай дзяўчынцы сваю будучую жонку. Гэта стала зразумела некалькі гадоў таму, калі пачуцці ў адносінах да Юлі перараслі братэрскія. Яму падабалася, што дзяўчына, нягледзячы на юны ўзрост, самастойная, а галоўнае — вельмі любіць дзяцей. І нават мары пра сям'ю, дзе сыноў і дачок павінна быць як мінімум з футбольную каманду, у іх супалі.

— Спачатку я крыху сумнявалася, якая з Юлі нявеста: на той момант ёй было ўсяго 18 гадоў, — усміхаецца Маргарыта Кундзікава. — А потым узгадала, што сама ў такім узросце замуж выскачыла. Супакоіла сябе: ну і што тут такога, хай сабе жэняцца. Тым больш Захар сур'ёзны чалавек, ён на 11 гадоў старэйшы за Юлю. У яго і сваё жыллё ўжо было, і праца добрая. Адным словам, тыл надзейны.

Іх «першынцы» — 7-гадовы Арцём і 4-гадовая Даша, «знайшлі» сваіх бацькоў праз раённую газету.

— Калі ўбачыў іх фота, міжволі стаў думаць, куды б мы разам пайшлі і што б зрабілі, — прызнаецца малады бацька. — Якраз у гэты момант патэлефанавала мама і быццам прачытала мае думкі: «Ну што, сын, ты трымаеш у руках тую ж газету, што і я?» Хутка дзеці былі ўжо ў нас.



Летась Захар і Юля сталі прыёмнымі бацькамі. З Дашай і Арцёмам.

Зараз нават не верыцца, што яшчэ год таму Даша была, як кажуць, «калючым вожыкам». Глядзела на сваю новую радню з падазронасцю і нават... укусіла тату. Зараз яна яго любіміца і намеснік па выхаваўчых справах. Яе слухаюцца нават старэйшыя дзеці, 15-гадовы Улад і 12-гадовая Луіза — яны пакуль жывуць у Чавусах і наведваюцца да сваіх прыёмных бацькоў толькі ў выхадныя і на святы. (Але днямі пераязджаюць у Клічаў на пастаяннае месца жыхарства.) А на «падыходзе» ўжо пятае прыёмнае дзіця, з якім сям'я зусім хутка пазнаёміцца.

— Не страшна браць на сябе такую адказнасць? — цікаўлюся ў Юлі.

— Мы на гэта ішлі свядома, — рашуча адказвае яна. — Я ўжо прывыкла, што мяне клічуць мамай. Спачатку крыху было не па сабе. Асабліва калі так назваў Улад, маладзейшы за мяне ўсяго на 6 гадоў. Але я ўжо прывыкла і рада. Вельмі прыемна, калі сябры кажуць, што дзеці падобныя да мяне. Нас не пужае і тое, што ў дзяцей могуць выявіцца нейкія адхіленні ў здароўі. Па сваёй спецыяльнасці я алігафрэнапедагог і дэфектолаг, розных дзяцей паспела пабачыць.

— Жыць без дзяцей нецікава, — у тон сваёй жонцы адказвае Захар. — Раней я палову заробку аддаваў маці, на падарункі сваім прыёмным сёстрам і братам. Мне радасна, калі бачу на іх тварах усмешкі. Калі шчыра, я па сваёй натуры быў эгаістам, але жыццё ў вялікай сям'і зрабіла мяне лепшым. Эгаіст любіць толькі сябе, а гэта сумна. Я шчаслівы, што ў мяне быў шанц адчуць, якое гэта шчасце — жыць для іншых.

***P.S.*** *Яшчэ адзін дзіцячы дом сямейнага тыпу адкрыўся напярэдадні Новага года ў вёсцы Сакольнічы Крычаўскага раёна. У сям'і Уладзіміра і Алы Галатоўскіх 5 дзяцей, трое з якіх прыёмныя. «У рэгіёне за апошнія гады вельмі шмат зроблена для таго, каб дзеці, якія з тых ці іншых прычын засталіся без апекі бацькоў, не адчувалі сябе кінутымі. Каля 85% такіх малых у вобласці знайшлі свае сем'і і атрымліваюць паўнавартаснае выхаванне», — адзначыў на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір Даманеўскі. Дарэчы, дом Захара і Юлі Кундзікавых у Клічаве стане 50-м па ліку.*

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*
**Фота аўтара**
**і з сямейнага архіва КУНДЗІКАВЫХ**



25 гадоў таму Маргарыта Кундзікава ўзяла з прытулку першых дзяцей (родны сын Захар — справа).

### КАМЕНТАРЫЙ ДА ТЭМЫ

**— Спадзяёмся, што Захар і Юля будуць добрымі бацькамі для сваіх прыёмных дзетак, — кажа начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Клічаўскага райвыканкама Аляксандр Мялешка. — Дом пабудаваны па інвестыцыйнай праграме «Нашы дзеці», тут створаны ўсе ўмовы для вялікай сям'і — сучасная планіроўка, прасторныя, светлыя пакоі. Маладыя людзі, якія будуць выконваць абавязкі выхавацеляў, выраслі ў знаёмым ім асяроддзі і з жаданнем бяруцца за справу. Мы іншыя кандыдатуры нават і не разглядалі. За кошт бюджэтных і спонсарскіх сродкаў дом цалкам укамплектаваны мэбляй і неабходнай бытавой тэхнікай. Вялікую дапамогу аказаў і Беларускі дзіцячы фонд, які ўзначальвае Аляксандр Трухан. І мы вельмі ўдзячны за гэтую дапамогу.**

■ Весткі з полюса холаду

# ВЕЦЕР І МЯЦЕЛІЦА НЕ СПЫНІЛІ ПАЛЯРНІКАЎ

## Падмурак для беларускай антарктычнай станцыі закладзены

**Напярэдадні Новага года ў раён базіравання Беларускай антарктычнай экспедыцыі каля гары Вячэрняя ва Усходняй Антарктыдзе з борта расійскага навукова-экспедыцыйнага судна «Акадэмік Фёдараў» верталётам былі дастаўлены элементы інфраструктуры Беларускай антарктычнай станцыі — першы лабараторна-жылы модуль, які складаецца з трох секцый. Агульная вага грузу — 22 тоны.**

Для ўсталявання першага модуля сіламі палярнікаў была змантавана спецыяльная платформа. Па словах начальніка Беларускай антарктычнай экспедыцыі Аляксея Гайдашова, гэтая аперацыя не мае аналагаў у гісторыі антарктычных экспедыцый. Палярнікам давялося працаваць на працягу трох дзён у вельмі складаных метэаўмовах: мяцеліцы (і агульнай, і нізавой) і моцнага ветру (яго хуткасць дасягала 25 метраў у секунду з парывамі да 32 метраў). Платформа паднята над паверхняй зямлі. Наяўнасць прасторы паміж платформай і зямлёй забяспечыць прадзімальнасць тэрыторыі вакол станцыі, што значна знізіць вышыню снежных заносаў. Аднак павышаная супраціўляльнасць заносам — не адзіная перавага модульнай канструкцыі. Зборка станцыі модульнага тыпу абыходзіцца значна танней, чым капітальнае збудаванне. Да таго ж такі прынцып будавання дазваляе неабмежавана павялічваць і памяншаць у выпадку неабходнасці колькасць модуляў.

**Палярнікам давялося працаваць на працягу трох дзён у вельмі складаных метэаўмовах: мяцеліцы (і агульнай, і нізавой) і моцнага ветру (яго хуткасць дасягала 25 метраў у секунду з парывамі да 32 метраў).**

Аляксей Гайдашоў паведаміў, што палявы лагер Беларускай антарктычнай экспедыцыі каля гары Вячэрняя гатовы да працы ў аўтаномным рэжыме. Асабісты склад здаровы і прыступіў да правядзення інжынерна-тэхнічных мерапрыемстваў па ўводзе ў эксплуатацыю першага аб'екта Беларускай антарктычнай станцыі і выкананні праграмы навуковых даследаванняў. Сродкі жыццезабеспячэння і сувязі правераны і ўведзены ў эксплуатацыю.

Беларуская антарктычная экспедыцыя сезона 2015-2016 гадоў — асаблівая. На ледзяным кантыненце зараз знаходзяцца, акрамя начальніка экспедыцыі Аляксея Гайдашова, урач-хірург Леанід Нікіцюк, гідраметэаназіральнік Сяргей Торбік, інжынер-радыёметрыст Максім Гарбацэвіч і майстар па эксплуатацыі і рамонце машын і механізмаў Аляксей Захватаў. Усе яны (акрамя вопытнага кіраўніка) — пачаткоўцы, але на іх ускладзена адказная задача — стварыць падмурак для будучай антарктычнай станцыі.

Нагадаем, што ў 2012 годзе Нацыянальная акадэмія навук па даручэнні Савета Міністраў распрацавала праект плана будаўніцтва Беларускай антарктычнай станцыі. Плануецца, што першую чаргу станцыі пабудуюць да 2018 года. Аб'ект будзе складацца з 8—10 модуляў і збірацца, як канструктар. Першы модуль, які ўжо дастаўлены ў Антарктыду, стане своеасаблівым штабам, дзе будзе ажыццяўляцца кіраванне экспедыцыяй: навігацыя, сувязь з Вялікай зямлёй і на мясцовасці. Тут таксама прадугледжаны і два жылыя адсекі.

Варта адзначыць, што ў жніўні 2015 года Беларусь на нарадзе ў горадзе Тромсе (Нарвегія) была прынята пастаянным членам Савета кіраўнікоў нацыянальных антарктычных праграм, што з'яўляецца прызнаннем заслуг краіны на сусветным узроўні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Сацыяльная кансультацыя

# ПЕНСІЯ ПА ЎЗРОСЦЕ:

## УСЁ АБ ТЫМ, ЯК ЯНА НАЛІЧВАЕЦЦА

**Час ляціць хутка. Здаецца, толькі ўчора быў маладым спецыялістам, а сёння ўжо ловіш сябе на думцы, што да заслужанага адпачынку рукой падаць. У сувязі са шматлікімі лістамі ў рэдакцыю, у якіх чытачы просяць патлумачыць, як на сённяшні дзень налічваецца пенсія па ўзросце, мы звярнуліся ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі. Аб некаторых момантах, звязаных з яе налічэннем, а таксама нюансах, ад якіх залежыць памер пенсіі, нам расказала начальнік упраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Алена ДРОНАВА.**



### Калі з'яўляецца права на працоўную пенсію?

Пенсія па ўзросце на агульных падставах прызначаецца пры дасягненні ўзросту мужчынамі 60 гадоў, жанчынамі — 55 і пры наяўнасці стажу працы, не меншага за 25/20 гадоў (адпаведна ў мужчын і жанчын).

**Парадак прызначэння і разліку памеру пенсій рэгулюецца Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 красавіка 1992 г. №1596-XII «Аб пенсійным забеспячэнні» і Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 8 снежня 2014 года №570 «Аб удасканаленні пенсійнага забеспячэння».**

Таксама на сённяшні дзень абавязковай умовай для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце з'яўляецца наяўнасць стажу працы з выплатай страхавых унёскаў, не менш за 15 гадоў 6 месяцаў як для мужчын, так і для жанчын. У такі стаж для вызначэння права на працоўную пенсію па ўзросце, акрамя працы на тэрыторыі Беларусі, уключаецца час працы ў перыяд СССР, а таксама на тэрыторыі дзяржаў, з якімі Рэспублікай Беларусь заключаны дагаворы ў галіне сацыяльнага (пенсійнага) забеспячэння пры ўмове выплаты абавязковых страхавых унёскаў у пенсійныя фонды гэтых дзяржаў.

У страхавы стаж не ўключаецца час водпуску па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў, атрыманне адукацыі на дзённай форме навучання, ваенная служба. Таксама не ўключаюцца перыяды, калі чалавек атрымліваў дапамогу па беспрацоўі. Гэта значыць, у разлік бярэцца так званы чысты працоўны стаж з выплатай страхавых унёскаў.

### Хто рыхтуе дакументы для прызначэння пенсіі?

Аб падрыхтоўцы дакументаў, якія пацвярджаюць стаж працы і зарплату, неабходна паклапаціцца загадзя, паколькі гэта можа заняць пэўны час.

Падрыхтоўкай дакументаў для прызначэння пенсіі працуючым грамадзянам займаецца кадравая служба або прадстаўнік прадпрыемства, арганізацыі, у якой працуе чалавек.

Непрацуючыя грамадзяне абавязаны займацца зборам дакументаў самі. Пры неабходнасці яны могуць звярнуцца па садзейнічанне ў запатрабаванні неабходных дакументаў у органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

### Ад чаго залежыць памер пенсіі?

Памер пенсіі па ўзросце залежыць ад працягласці стажу працы і заработнай платы, якую чалавек атрымліваў да выхаду на пенсію. Пенсіі па ўзросце прызначаюцца ў памеры 55 працэнтаў ад індывідуальнага заробку чалавека, прынятага для вылічэння пенсіі. За кожны поўны год стажу работы звыш 20/25 гадоў жанчынам і мужчынам адпаведна пенсія павялічваецца на 1% заробку, але не менш чым на 1% мінімальнай пенсіі па ўзросце. У кожнага пенсіянера цана аднаго года стажу працы свая ў залежнасці ад велічыні індывідуальнага каэфіцыента заробку, з улікам якога яму вылічаецца пенсія.

Зараз пенсія вылічаецца з адкарэкціраванага фактычнага заробку за апошнія 21 год запар стажу працы. Пачынаючы з 1 студзеня 2016 года названы 21-гадовы перыяд штогод будзе павялічвацца на 1 год.

Што рабіць, калі ў працоўнай дзейнасці былі перапынкі? Паводле слоў спецыяліста, гэта не мае ніякага значэння для налічэння пенсіі. Справа ў тым, што перапынкі ў працоўнай дзейнасці не ўключаюцца ў працоўны стаж. Такі перыяд не з'яўляецца каляндарным, у яго ўключаюцца толькі перыяды стажу працы.

У выпадку ўключэння ў агульны працоўны стаж іншых перыядаў (вучоба, догляд дзіцяці, атрыманне дапамогі па беспрацоўі і інш.) у якасці фактычнага заробку ў разлік прымаецца 40% сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы за адпаведныя месяцы.

**У лістападзе 2015 года сярэдні памер пенсіі па ўзросце склаў 2 млн 897 тысяч рублёў. Як адзначаюць у Мінпрацы і сацабароны, гэта ў 2,4 раза вышэй за бюджэт пражытачнага мінімуму пенсіянера (БПМ пенсіянера зараз роўны 1 млн 196 тысячам рублёў).**

***Наша даведка: што такое індывідуальны каэфіцыент заробку***

*Індывідуальны каэфіцыент заробку з'яўляецца адлюстраваннем узроўню заробку канкрэтнай асобы: у якіх суадносінах знаходзіцца велічыня фактычнай зарплаты кожнага работніка і велічыня сярэдняй зарплаты работнікаў у рэспубліцы ў адпаведных месяцах. Ён вызначаецца вынікам дзялення фактычнага заробку асобы, якая звярнулася па пенсію, за кожны месяц з выбранага для разліку пенсіі перыяду на сярэднюю заработную плату работнікаў у рэспубліцы за тыя ж месяцы. Звесткі аб фактычным заробку бяруцца з даведкі аб заробку, прадастаўленай для вылічэння пенсіі. Індывідуальны каэфіцыент дапамагае прывесці мінулы заробак да сучаснага ўзроўню (гэта значыць, атрымаць адкарэкціраваны заробак для вылічэння памеру пенсіі).*

Карэкціроўка ажыццяўляецца памнажэннем сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы, якая прымяняецца пры пераразліку працоўных пенсій, на індывідуальны каэфіцыент заробку.

Для вылічэння памеру пенсій заробак, не вышэйшы за 130% сярэдняй зарплаты работнікаў у рэспубліцы, якая прымяняецца для карэкціроўкі фактычнага заробку пенсіянера, у межах 10% названай велічыні ўлічваецца цалкам, а ў межах кожных наступных 10% — адпаведна ў памеры 90, 80, 70, 60, 50, 40, 30, 20 і 10%. Заробак у межах ад 130 да 400% сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы ўлічваецца ў памеры 10%.

### Як можна павялічыць сваю пенсію?

Заканадаўствам прадугледжана магчымасць павелічэння пенсіі па ўзросце праз працяг працы пасля набыцця права на гэтую пенсію: па-першае, у выпадку звароту па яе прызначэнне пазней дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту або, па-другое, у выпадку афіцыйнай адмовы ад атрымання ўжо прызначанай пенсіі.

Так, за першы поўны год працы без атрымання пенсіі яна будзе павялічана на 6% заробку, які прымаецца для яе вылічэння, за другі — на 8%, за трэці — на 10%, за чацвёрты — на 12%, за пяты і кожны наступны год — на 14%. Калі праца без атрымання пенсіі працягваецца менш за поўны год, то павелічэнне пенсіі за кожныя поўныя два месяцы такой працы складае 1% заробку. Пры гэтым пенсія максімальным памерам (75% заробку) не абмяжоўваецца.

У выніку за 5 гадоў працы без атрымання пенсіі яе памер павялічыцца ў 1,7 — 2 разы.

### Навінкі апошняга часу: павышэнне пенсіі асобам з доўгім працоўным стажам

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 8 снежня 2014 года №570 «Аб удасканаленні пенсійнага забеспячэння» прадугледжаны комплекс мер, накіраваных на павышэнне пенсіі асобам з доўгім стажам працы. Павышэнне пенсіі ажыццяўляецца паэтапна. Так, з 1 студзеня 2015 года для асоб, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, павялічана мінімальная цана аднаго года стажу работы звыш 35 гадоў у мужчын і 30 гадоў у жанчын да 0,7% сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы, што прымяняецца для карэкціроўкі фактычнага заробку пенсіянера. З верасня 2015 года гэта — не менш за 41,5 тысячы рублёў.

З 1 студзеня 2016 года за кожны поўны год стажу работы звыш 40 гадоў па 45 гадоў уключна ў мужчын і звыш 35 гадоў па 40 гадоў уключна ў жанчын пенсіі дадаткова павялічваюцца на 0,1; 0,2; 0,3; 0,4; 0,5% сярэднямесячнага заробку, які не можа быць меншы за 0,7% сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы, што прымяняецца для карэкціроўкі фактычнага заробку пенсіянера.

**Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 студзеня 2012 года №35 «Аб павышэнні пенсіі» прадугледжана мэтавая даплата атрымальнікам пенсій у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, якія дасягнулі ўзросту 75 і 80 гадоў і не працуюць зараз, на 75 і 100% мінімальнай пенсіі па ўзросце адпаведна.**

### Што яшчэ новага чакаецца з 2016 года?

Мужчынам са стажам працы 36 гадоў і жанчынам са стажам 31 год пры вылічэнні працоўнай пенсіі будзе ўлічвацца заробак у памеры да 5-кратнай сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы (сёння лімітавая велічыня заработнай платы для вылічэння пенсіі складае 4 сярэднія заработныя платы, што адпавядае індывідуальнаму каэфіцыенту заробку пенсіянера 4,0).

Таксама з 1 студзеня 2016 года стаж працы з выплатай страхавых узносаў павысіўся да 15 гадоў 6 месяцаў для набыцця права на працоўную пенсію па ўзросце, а пачынаючы з 1 студзеня 2017 года — будзе павышацца штогод на 6 месяцаў да дасягнення 20 гадоў.

**Святлана БУСЬКО,**
*busko@zviazda.by*

■

## Некалькі дадатковых наіўных пытанняў аб пенсіі

**Ці ўключаецца ў стаж для прызначэння пенсіі ваенная служба і вучоба?**

Ваенная служба ўключаецца ў агульны стаж, але не ў страхавы. Таксама ў агульны стаж, але не ў страхавы ўключаюцца перыяды атрымання на дзённай форме прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і паслявузаўскай адукацыі, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі рабочых (служачых), прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), навучальных курсаў па накіраванні ўпраўленняў (аддзелаў) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, праходжання падрыхтоўкі ў клінічнай ардынатуры.

**Ці ўключаецца ў стаж і заробак для прызначэння пенсіі работа па сумяшчальніцтве?**

У агульны стаж для прызначэння пенсіі перыяды работы па сумяшчальніцтве не ўключаюцца, калі каляндарна супадаюць з перыядамі працы па асноўным месцы.

У заробак для вылічэння пенсіі ўключаюцца выплаты ўсіх відаў, у тым ліку за працу па сумяшчальніцтве, на якія, згодна з заканадаўствам, налічваліся і з якіх выплачваліся абавязковыя страхавыя ўнёскі.

**Ці залічваецца ў агульны працоўны стаж праца па грамадзянска-прававых дагаворах?**

Так, залічваецца, але толькі пры ўмове выплаты абавязковых страхавых унёскаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацабароны.

**Страхавы стаж павінен быць бесперапынным?**

Паняцце бесперапыннага стажу ўжо даўно адышло ў нябыт. Так што 15 с паловай «страхавых» гадоў можна збіраць на працягу ўсяго жыцця.

**Што будзе, калі падышоў пенсійны ўзрост, але чалавек яшчэ не мае ў сваёй працоўнай кніжцы неабходных гадоў страхавога стажу?**

Калі пры адсутнасці неабходнага страхавога стажу чалавек звяртаецца па прызначэнне пенсіі, яму можа быць прызначана толькі сацыяльная пенсія па дасягненні ўзросту 60 гадоў (для жанчын) і 65 гадоў (для мужчын). Сёння яе памер складае 50% найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва за два апошнія кварталы. Працоўная пенсія па ўзросце можа быць прызначана пры ўмове дапрацоўкі страхавога стажу да неабходнай працягласці.

## ■ Дзяржава і бізнес

# АЎТАЗАПЧАСТКІ ЯШЧЭ ГОД БЕЗ СЕРТЫФІКАТАЎ

**Беларусам дазволілі дапрадаць рэшткі аўтазапчастак, якія завезлі да 1 студзеня 2016 года без дакументаў аб пацвярджэнні адпаведнасці тэхнічнаму рэгламенту. Тэрмін іх рэалізацыі ў краіне падоўжаны да 1 студзеня 2017 года.**

Аднак, як адзначыў **старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА**, пасля ўстаноўленага тэрміну ўсе астатнія аўтакампаненты будуць абавязаны мець адпаведныя сертыфікаты, дэкларацыі, як гэта прадугледжана рэгламентам. Гэтая норма распаўсюджваецца на кампаненты транспартных сродкаў, якія раней не падлягалі абавязковаму пацвярджэнню адпаведнасці ў Беларусі да ўступлення ў сілу 1 студзеня сёлета тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы колавых транспартных сродкаў». Старшыня Дзяржстандарту адзначыў, што ў краіне зараз каля 20 лабараторый, у якіх можна прайсці выпрабаванні і атрымаць неабходныя дакументы па некаторых відах кампанентаў. Акрамя таго, зараз Дзяржстандарт сумесна з Мінпрамам і асацыяцыямі аўтамабілістаў прапануюць скараціць спіс аўтазапчастак, якія падлягаюць сертыфікацыі. Віктар Назаранка падкрэсліў, што многія віды камплектуючых не зусім дакладна ўключаны ў пералік і не павінны суправаджацца дакументамі. Ён лічыць, што існуючы пералік трэба паменшыць на 25-30%.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■

## ■ Добрая навіна

# У АСТРАЎЦЫ АДКРЫЎСЯ ДЗІЦЯЧЫ ДОМ СЯМЕЙНАГА ТЫПУ

**У Генадзя і Наталлі Сінкевічаў, якіх прынялі на працу бацькамі-выхавальнікамі ў раённы аддзел адукацыі, зараз пяцёра біялагічных дзяцей і чацвёра прыёмных.**

Будынак дома сямейнага тыпу (двухпавярховы катэдж з мэбляй, бытавой тэхнікай і іншай дамашняй маёмасцю) пабудавалі работнікі Смаргонскага будтрэста № 41 за сродкі з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў — затрачана каля 4,5 мільярда рублёў. Аб аснашчэнні дома ўсім неабходным паклапаціліся раённыя ўлады, прадпрыемствы і арганізацыі Астравеччыны.

— Гэта ўжо 24-я падобная ўстанова на Гродзеншчыне. Такая форма выхавання дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, найбольш прымальная, — зазначыў падчас урачыстай перадачы дома сямейнага тыпу яго гаспадарам намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама, дэпутатат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Віктар Лісковіч.

У гэтым годзе дамы сямейнага тыпу плануецца пабудаваць на Навагрудчыне і ў Кастрычніцкім раёне абласнога цэнтра. Разам з тым, будзе закрыты яшчэ адзін дом-інтэрнат.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■

## ■ Крымінал

# ПАРУШАЛЬНІКАЎ — ДА АДКАЗУ

**Каму свята прынесла добры настрой, а каму — лішнія цяжкасці. У першыя тры дні новага года за кіраванне аўтамабілем у стане алкагольнага ап'янення затрымалі 280 вадзіцеляў. Як паведамляе Дзяржаўтаінспекцыя, за перавышэнне хуткасці аштрафаваны 1378 кіроўцаў. Не абышлося і без аварый. На жаль, адна з іх прынесла сумны вынік.**

У першы дзень 2016 года 42-гадовы мінчанін нападпітку збіў каля прысталічнай вёскі Тарасава жанчыну, што знаходзілася на абочыне. Вадзіцель з месца здарэння з'ехаў, але пасля быў затрыманы. У дачыненні да яго заведзена крымінальная справа.

Што тычыцца халоднага надвор'я, ДАІ раіць аўтамабілістам устрымацца ад паездак на вялікія адлегласці. Пры крайняй неабходнасці адпраўляйцеся ў дарогу толькі пасля таго, як старанна праверыце спраўнасць аўто.

**Якаў ЖУРБІН.** *taras@zviazda.by*

# КВАТАРАНТ СКРАЎ УЗНАГАРОДЫ

**У аператыўна-дзяжурную службу Кастрычніцкага РУУС сталіцы звярнулася жанчына з заявай: з кватэры зніклі залатыя пярсцёнкі, ордэны і медалі, што належалі яе сужэнцу-нябожчыку, ветэрану Вялікай Айчыннай вайны. Удава расказала, што з жылля нядаўна з'ехаў кватарант — 23-гадовы малады чалавек з Бабруйска.**

У тэлефоннай размове з аператыўнікамі той спачатку запэўніў, што чужой маёмасці не браў. Аднак праз нейкі час перастаў выходзіць на сувязь. Асобу маладога чалавека тут жа высветлілі. Аказалася, што хлопец ужо двойчы быў судзімы за крадзяжы. У яго дома міліцыянеры знайшлі чатыры медалі. Астатнія ўзнагароды ён паспеў прадаць. Сярод скрадзенага былі ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені і Айчыннай вайны I ступені. Пацярпелая патлумачыла, што пасля знікнення залатых вырабаў не стала званіць праваахоўнікам, каб не псаваць лёс маладому чалавеку. Аднак, выявіўшы прапажу ўзнагарод сужэнца, мусіла звярнуцца па дапамогу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■


## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона по продаже имущества УПП «Янина» ОАО «ЛМЗ Универсал»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Ликвидационная комиссия УПП «Янина» ОАО «ЛМЗ Универсал», 223710, Минская обл., г. Солигорск, ул. Заводская, 4, тел. 8 017 4 26 99 25 |
| **Продавец** | УПП «Янина» ОАО «ЛМЗ Универсал», тел. 8 017 4 26 98 16 |
| **Форма проведения торгов** | Торги в форме аукциона |
| **Дата и место проведения торгов** | 14.01.2016 в 13.00 в конференц-зале ОАО «ЛМЗ Универсал»: 223710, Минская обл., г. Солигорск, ул. Заводская, 4 |
| **Сведения о предмете торгов** | **Лот №** / **Наименование товара** / **Начальная цена за лот., с НДС, бел. руб.**<br>1 / Готовая швейная продукция / 95 749 480<br>2 / Костюмы мужские рабочие / 50 855 040<br>3 / Спецодежда / 49 354 880 |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомиться с предметом торгов можно в пн. – пт. с 9.00 до 16.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Заводская, 4, тел. 8 017 4 26 99 38 (26 98 16). Срок для ознакомления – до окончания приема заявлений |
| **Дата и место начала и окончания приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов** | Заявление на участие в аукционе подается заинтересованным лицом в срок до 13.01.2016 комиссии по организации аукциона пн. – пт. с 10.00 до 14.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Заводская, 4, тел. 8 017 4 26 99 39. Заявление на участие в аукционе после указанного срока не принимается. К заявлению представляется документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка и другие документы согласно перечню, указанному в извещении |
| **Размер, порядок и сроки внесения задатка, банковские реквизиты, на которые должна быть перечислена сумма задатка** | Сумма задатка устанавливается в размере 10% от начальной цены предмета торгов (лота). Р/с 3012141892018 в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Солигорска, код 153001369, УНП 600270786. Назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе |
| **Перечень документов прилагаемых к заявлению на участие в торгах** | Лицом, желающим участвовать в торгах представляются:<br>юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава, имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;<br>юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;<br>индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;<br>индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;<br>представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;<br>представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.<br>При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов |
| **Порядок оформления участия в торгах** | К участию в торгах допускаются лица, подавшие комиссии по организации аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке |
| **Порядок проведения торгов** | Шаг аукциона – 5%. Победителем торгов будет объявлено лицо, предложившее наибольшую цену либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) данный участник становится претендентом на покупку. Результаты торгов оформляются протоколом, который подписывается комиссией по организации аукциона и победителем торгов, утверждается организатором торгов в день проведения торгов. Договор купли-продажи подписывается в 10-дневный срок с даты подписания протокола после предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение торгов |
| **Условия оплаты** | Согласовываются Победителем аукциона и Продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение торгов** | Возмещение затрат на организацию (публикации в СМИ, поиск потенциальных покупателей и т.п.) и проведение торгов (оплата услуг аукциониста) производится победителем аукциона путем перечисления на расчетный счет в течение пяти дней со дня проведения торгов |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

| |
|---|
| **Продавец:** ОАО «Витрембыт», 210035, г. Витебск, ул. Терешковой, 3, тел. (0212)48-79-82 |
| Лот №1. Изолированное помещение с инв. №240/D-42005 по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Черняховского, 7А-1, площадью 327,1 кв.м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение, в т.ч. места общего пользования: котельная, коридор, тамбур, административное помещение с асфальтобетонным покрытием, воротами металлическими, забором металлическим, водопроводной сетью, кабельной линией, канализационной сетью, наружной газовой сетью. **Начальная цена:** 1 401 879 360 бел. руб. с НДС**. Размер задатка:** 140 187 000 бел. руб. |
| Лот №2. Капитальное строение с инв. №240/С-37346 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Черняховского, 7а, площадью 233,3 кв.м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование – здание склада. **Начальная цена:** 124 222 080 бел. руб. с НДС**. Размер задатка:** 12 422 000 бел. руб. |
| Повторный аукцион состоится **16.01.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: с 05.01.2016 с 8.30 по 15.01.2016 до 17.00. Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Покупателю по его письменному заявлению может предоставляться рассрочка оплаты на срок до 9 месяцев. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым №242400000004001353 площадью 0,4181 га под производственную базу. Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». |

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона производится в сроки, указанные в договоре купли-продажи. Обременение лота №1: договор аренды нежилого помещения площадью 21,68 кв.м до 10.04.2016. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор аукционов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №240100000002009158, площадью 0,1278 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 8-я Загородная, 2А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена**: 336 505 176 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №240100000003009582, площадью 0,1105 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 7 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 232 528 052 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 05.02.2016 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 05.01.2016 с 8.30 по 04.02.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане и негосударственные юр. лица Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить разрешения на проведение проектно-изыскательных работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца с момента гос. регистрации права на земельный участок; в течение 6 месяцев (для юр. лиц) и 1 года (для граждан) со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3642302000280 в ф-ле № 200 Витебское обл. управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №225882000401000204, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Шумилинский р-н, Светлосельский с/с, аг. Башни, ул. Садовая, 13 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (озеро Будовесть), охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000В. **Начальная цена**: 11 721 800 бел. руб. **Размер задатка:** 1 172 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 09.02.2016 в 14.15 по адресу: Витебская обл., г.п. Шумилино, ул. Короткина, 10, каб. 226 в Шумилинском райисполкоме. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 05.01.2016 с 8.30 по 08.02.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30; 09.02.2016 с 11.00 до 13.00 по адресу: Витебская обл., г.п. Шумилино, ул. Короткина, 10, каб. 226 в Шумилинском райисполкоме. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий 1 года; приступить к занятию зем. участка (начать строительство) в течение 1 года со дня утверждения проектной документации; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы из-под габаритов здания для благоустройства прилегающей территории. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600331075013 в ЦБУ №225 г.п. Шумилино, ф-л №200 ВОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300988882, код платежа 04901, получатель платежа Светлосельский сельисполком. |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. В аукционе допускается участие консолидированных участников (двух и более граждан, юр. лиц). **Для участия в аукционе** гражданин, юр. лицо подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, а представители граждан и юр. лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо предъявляет доверенности, выданные гражданами, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. **Условия аукциона:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

# Беларускі народны каляндар на 2016 год

**НАРОДНЫ КАЛЯНДАР** — *гэта сістэма сталых ці рухомых свят, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, звычаяў, што замацаваны ў быце і фальклоры. Гэта пераважна спалучэнне язычніцкай і хрысціянскай культуры. Фальклорны каляндар складзены на аснове хранонімаў, якія зафіксаваны ў вуснай народнай творчасці беларусаў і ўключае традыцыйныя арыенціры на сельскагаспадарчыя работы і адпачынкі ў гадавым, сезонным, месячным і іншых цыклах-рытмах. Утрымлівае традыцыйныя феналагічныя, метэаралагічныя, аграномічныя, астранамічныя, астралагічныя і іншыя каляндарныя веды, атрыманыя пераважна дзякуючы шматгадоваму вопыту.*

**У народным календары на 2016, высакосны, год прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі і г. д. Дні (хранонімы), якія адзначаюць беларусы-каталікі, выдзелены курсівам. У праваслаўных яны замацаваны за старым, юліянскім, календаром, што мае 13 лішніх дзён. Зорачкай /*/ пазначаны святы «рухомай» царкоўнай пасхаліі.**

**Умоўныя абазначэнні: п. — панядзелак, а. — аўторак, с. — серада, ч. — чацвер, пт. — пятніца, сб. — субота, н. — нядзеля. Даўжыня дня і моманты ўсходу і захаду падаюцца для Мінска.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Студзень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

**Люты**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | | | | | | |

**Сакавік**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

**Красавік**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | |

**Май**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**Чэрвень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

**Ліпень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

**Жнівень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

**Верасень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

**Кастрычнік**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

**Лістапад**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

**Снежань**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

## Студзень

**1. пт. Новы год.** ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 годзе, Расія — з 1700 года.

**6. с. Першая, Посная куцця.** Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Тры Каралі.*** Каталікі праводзілі маскіраваны абрад «Тры каралі», або «Гэроды».

**7. ч. Раство Хрыстова.** Пачатак Каляд. «Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі...» Калядавалі. Насілі «звязду». Паказвалі батлейку. На Каляды праводзілі ігрышчы («вадзілі казу», «жанілі Цярэшку», «пяклі ката», гулялі ў «Яшчура» і інш.).

**9. сб. Сцяпан.** «На Святога Сцяпана вышэй слуга за пана».

**13. с. Шчодрая куцця.** Пачатак Шчодрага тыдня. «Мароз, хадзі куццю есці».

**14. ч. Васілле.** Новы год па праваслаўным календары. «Сею, сею, пасяваю, з Новым годам вас вітаю».

**18. п. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця.** Апошнія дні Каляд. «Каляда ад'язджае».

**19. а. Вадохрышча (Кшчэнне).** «Святое Кшчэнне ваду ксціла, свет ачысціла і ваду наверх пусціла», «На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама».

**20. с. Прывадохрышча** — заканчэнне Каляд. Пачатак Малой вясельніцы (да посту).

**24. н. *Аксіння.*** «Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце». **Фядос.** «На Фядоса цёпла».

**25. п. Таццяна.** Свята студэнтаў. ***Павел.***

**31. н. Апанас.** Гусінае свята. Свята свойскай жывёлы. «Хавай нос у апанасаўскі мароз».

## Люты

**1. п. *Ігнат.*** «На Святога Ігната зіма багата».

**2. а. *Грамніцы, Стрэчанне.*** «Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы», «Грамніца — хлебу палавіца».

**5. пт. *Агата.*** «Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты».

**6. сб. Аксіння-паўзімніца.** «На Аксінню мяце». ***Дарота.*** «Па Дароце высахнуць хусты на плоце».

**10. с. *_Папяльцовая серада_** (пачатак Вялікага посту ў каталікоў).

**11. ч. Ігнат.** «Ігнат Грамніцам рад».

**14. н. Трыфан.** «На Трыфана зорна — вясна позняя». ***Валянцін.*** Свята закаханых.

**15. п. Грамніцы, Стрэчанне.** «Зіма з летам сустракалася...», «На Грамніцы палавіна зіміцы».

**18. ч. Агата.** Каровіна свята.

**24. с. Улассе.** Свята жывёлы. «Аўлас на сыры лас». ***Мацей.*** «На Мацея адліга — будзе мароз».

**26. пт. Фаціння** — Заступніца ад хвароб.

**29. п. *Памінальніца.** Памінальны тыдзень. Калі «вея» ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі «дзесяцінкі дзве».

## Сакавік

**4. пт. *Дзедава пятніца. *Казімір.*** «Святы Казімір дровы сячэ».

**5. сб. *Масленыя Дзяды (Бабы).**

**6. н. *Рабы тыдзень, Малая вясельніца, Развітальны, Сырапусны тыдзень.** Тыдзень перад Масленіцай. Які добры дзень на Масленічным тыдні, у той дзень ад Ілы сеялі лён. Дзяўчаты вешалі «калодкі» нежанатым хлопцам.

**9. с. *Лысая серада.** Праталіны-залысіны. **Янка, Паўраценне.** Мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на другі бок.

**10. ч. *Блакітны чацвер.** Тумановы дзень. ***Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валоссе.** Свята жывёлы. «На Валосага бліны пяклі ці аладкі, каб былі валы гладкі».

**12. сб. *Рыгор.*** «На Святога Рыгора ідуць рэкі ў мора».

**13. н. *Масленіца.** «Масленіца ў «вятху» (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку». *Гуканне вясны. «Блаславі, Божа, зіму замыкаці, вясну загукаці». На Палессі вадзілі карагоды, «спявалі чырачку», насілі ёлку з вянком. **Васіль Капальнік.** Са стрэх капае.

**14. пн. *Паласказуб.** Першы дзень Вялікага посту. Паласкалі зубы гарэлкаю. **Аўдоцця-вясноўка.** Гуканне вясны. «На Аўдокі голы бокі». (1.03 — Новы год у мінулым, сакавіцкі каляндарны стыль).

**15. а. Хвядот.** «На Хвядота занос — усё сена знясе».

**16. с. *Уступная серада.** Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і пераскаквалі цераз пень.

**17. ч.** Вясновае раўнадзенства. Усход 7.17, захад 19.18. **Герасім Гракоўнік.** «Герасім гракоў прыгнаў».

**19. сб. *Зборава субота.** Абрад «споведзі дзежкі». ***Язэп.*** «Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту». «На Язэпа пагода — год ураджайны».

**20. н. *_Пальмова нядзеля._** «Вярба б'е, не я б'ю». ***Зборніца, Ізбор.** Адзін з варыянтаў Новага года/лета падчас прыняцця юліянскага летазлічэння. Пачатак збору ў поле. «На святы Ізбор — бяжыць вада з гор».

**22. а. Саракі.** Свята птушак. Прылятае 40 выраяў. «Святыя Саракі ў поле саху валаклі». ***Прыска.*** «На Святога Прыску праб'е лёд і пліска».

**25. пт. Рыгор.** «На Рыгора зіма ідзе ў мора». ***Дабравешчанне, Звеставанне.*** «І птушка гнязда не кладзе». Прылёт бусла. Гуканне вясны.

**26. сб. Міжблагавешчыны** (да 7 красавіка). Забарона на «запасванне» кароў.

**27. н. *_ВЯЛІКДЗЕНЬ_** (у каталікоў). ***Арына.*** «На Арыну сей капусту ў расадніках».

**30. с. Аляксей Цёплы.** Дзень рыбалова. «На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою».

## Красавік

**1. пт. Дар'я Вясенняя.** Адбельвалі палотны.

**4. п.** *Пачатак **Храстовага тыдня.** Пяклі «храсты». Засеўкі. Абрад «жаніцьбы коміна».

**6. с. *Серадапосце.** Выпякалі «храстцы». Камаедзіца. Свята мядзведзя. Пяклі пірагі «буславы лапы».

**7. ч. Дабравешчанне.** «Дабравешчанне без ластавак — халоднае лета». Абрад «Страла».

**8. пт. Благуста.** «На Благусту сей капусту».

**9. сб. Матрона.** «На Матрону шчупак хвастом лёд разбівае».

**11. п.** Пачатак ***Пахвальнага тыдня.** «Дзікая качка яйцом пахваліцца».

**14. ч. Мар'я.** Калі ў ясную ноч прыбывала вада, то суха будзе ў жніво на хлебнай ніве.

**15. пт. *Пахвальная пятніца.** Мыццё дзежак. **Палікарп.** Пачатак бясхлебіцы.

**16. сб. *Пахвальная субота.** Не грымелі кроснамі, каб гром не грымеў. **Мікіта.** «Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбаловам».

**18. п.** Пачатак ***Вербнага тыдня.**

**21. ч. Руф.** «Руф рушыць снягі».

**23. сб. *Юры.*** (Новы год па задыяку). «Як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я на «голы» лес, то не чакай ураджаю і будзе хварэць жывёла». ***Войцах.*** «Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху».

**24. н. *Вербніца. Анціп** — ахоўнік зубоў.

**25. п.** Пачатак ***Белага, Вялікага, тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі ў хаце. ***Марк.*** «Дождж на Марка, дык зямля як шкварка».

**26. а. *Чысты аўторак.** Каб на людзей і «гаўядо» не напала «парша», трэба ўсё мыць.

**27. с. *Драўляная страсць.** Мыюць усё драўлянае.

**28. ч. *Чысты чацвер.** Лазня. Абрад мыцця дзежкі. **Пуд.** «Пуд снег пугне».

**29. пт. *Чырвоная, Велікодная, пятніца.** Сеялі гарох. **Арына.** «На Арыну сей капусту».

**30. сб. *Вялікая, Чырвоная, субота.** Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту. **Зосім** — ахоўнік пчол. **Андрыянава ноч, Андрэй.** Ноч дзявочай варажбы і чараўніцтва.

## Май

**1. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ** (у праваслаўных). «Хрыстос уваскрэс! — Сапраўды ўваскрэс!» **Кузьма.** «Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гурком».

**2. п.** Працяг ***Велікоднага тыдня.** «Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні пагуляюць, а паследні дзень выпраўляюць». Свята сена (Тураўшчына).

**4. с. *Градавая серада. Праводны, Мёртвы, тыдзень.** «Пайшла зіма да Кіева, а лета нам пакінула».

**5. ч. *_Ушэсце._** Унебаўшэсце пана Езуса. Свята агляду жыта. Ляльнік. Свята Лялі — дачкі Лады.

**6. пт. Юр'е.** Свята жывёлы. «Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня». Абрад «Страла».

**7. сб. Алісей.** «Прыйшоў Алісей — авёс пасей». Бабскія розбрыкі. Скокі жанчын і качанне па зямлі дзеля ўрадлівасці.

**8. н. *Праводная нядзеля.** «Ідзі, зіма, да Кучава, як ты нам надакучыла». ***Марк***. «Дождж на Святога Марка — дык зямля як шкварка». ***Станіслаў.*** «Сей лён на Станіслава — вырасце як лава».

**9. п. *Радаўнічныя Дзяды.**

**10. а. *Радаўніца.** «На Радаўніцу да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а к вечару скачуць». Ярылавіца. Свята Ярылы.

**13. пт. Якуб.** «На Якуба грэе люба».

**14. сб. Макарэй.** Абрады ля вады.

**15. н. *_Сёмуха, Сыход Святога Духа._** Свята зелені. **Барыс** — апякун поля і жывёлы.

**18. с. Арына-расадніца.** Дзень высаджвання расады ў Паазер'і.

**20. пт. Антоній.** «На Святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца, дык і прадасца».

**21. сб. Іван Веснавы** — апякун земляроба. «На Івана каласок, а на Пятра піражок».

**22. н. *Міраносцы. Мікола Веснавы.** Свята пастухоў. ***Алена.*** «Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена».

**23. п.** Пачатак ***Пераплаўнага, Чарвівага, тыдня.** Не трэба садзіць, бо заядуць чэрві. **Зілот.** «Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе як злата».

**24. а. Макей.** «Мокра на Макея — і лета не прасушыць». **Кірыла і Мяфод.** Калі дзень мокры — і лета будзе мокрае.

**25. с. *Градавая, Пераплаўная, серада.** Засцярогі ад граду і дажджу. **Епіфан.** «На Епіфана раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю — гарачае лета».

**26. ч. *_Божае цела._** Зелянок.

**27. пт. Сідары.** «Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы».

**28. сб. Пахом.** «Святы Пахом павее цяплом». «Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом».

**29. *н. Магдалена.*** Зязюльку прысылае.

**31. а. Шэсць дзеў.** «Лён сей позні». **Матруна-канапелька.** «У зямлю махнула». **Фядот.** «Як на дубе апушка — у Фядота поўна аўса кадушка».

## Чэрвень

**2. ч. Тры пакутнікі.** «Няма лета, але пасля іх не бывае зімы».

**3. пт. *Градабойцы, Ледавіты дзень. Алена, Ульяна.** Дзень ільну.

**4. сб. Васіліск.** «Ад Васіліска і салавей блізка».

**5. н. Дзень Ефрасінні Полацкай.** Хадзілі пакланіцца і абракацца.

**7. а. Ян.** «Рой перад Янам — пчаляр панам».

**9. ч. *Ушэсце.** Абрад «Страла».

**13. п. Ерамей. *Антоній.*** «Антоні, аддай коні».

**14. а. Юстын і Харытон.** «Юстын цягне ўверх каноплі, а Харытон — лён».

**15. с. *Градавая серада.**

**16. ч. Лук'ян.** Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых.

**18. сб. *Сёмушныя Дзяды. Духавая субота, Зялёная субота.**

**19. н. *Сёмуха, Тройца.** Культ продкаў і раслiннасці. «Павядзём Куста пад гай зялёненькі...»

**20. п.*Святы Дух.** «На Духа будзе цёпла і суха». **Русальніца, Іван ды Мар'я.** Праводзіны вясны. «На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі...» Летняе сонцастаянне (з 17.06 да 23). Даўжыня дня — 17.07. Усход — 4.38, захад — 21.45.

**21. а. *Конскі Вялікдзень.** Свята коней. **Тодар.**

**22. с. *Градабой, Серада-русаль.** Здабывалі з ясеня святы агонь. **Кірыла.** Пачыналі касавіцу ў Паазер'і.

**23. ч. *Наўская Тройца.** Памінанне. **Аблівaха. *Купала.*** У старажытнасці — Новы год/лета.

**24. пт. *Ян Купальны.*** «Сонца грае».

**25. сб. Анапрэй.** «Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ».

**26. н. *Русальчыны розыгры.** Засцерагаліся рос. **Акуліна-грачышніца.** Сеялі грэчку. Задзярыхвост.

**27. п. *Пятроўка** да 11 ліпеня. Пятроўскі пост. Пятроўка-галадоўка.

**28. а. Амос.** «Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс»

**29. с. Ціхан.** «Пеўчыя птушкі заціхаюць». ***Пятрок.*** «Да Пятра зязюльцы кукаваці». «Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілья — ападуць і два».

**30. ч. *Дзявятнік.** «Дзевяць ягадзін на ветцы».

## Ліпень

**1. пт. *Дзевятуха.** Дзень ад навальніцы.

**6. с. Купалле.** Свята Сонца і кахання. «Дзень — адбаўленне, ночы прыбаўленне».

**7. ч. *Дзясятнік.** «Дзясятнік гнаі возіць». **Іван Купала.** «Учора была Купала, а сёння Іван».

**8. пт. *Дзясятка.** «Косы точыць». «Жыта паспявае».

**10. н. Самсон.** «На Самсона дождж — сем тыдняў то ж». ***Сем братоў.*** «Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды».

**12. а. Пятро.** Свята заканчэння Купалля.

**13. с. Паўпятро.** Дзень талакі. **Сымон і Юда.** «На Сымана й Юду конь баіцца груду».

**14. ч. Кузьма і Дзям'ян.** Свята кавалёў. «Святы Пятро жыта спеліць, Св. Кузьма сярпы робіць, а Св. Дзям'ян сена грабе».

**17. н. Андрэй.** «Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма». «Андрэй усіх мудрэй».

**18. п. Свята Месяца.** «Месяц гуляе».

**21. ч. Казанская. Пракоп.** «Пракоп бок прыпёк». ***Данат.*** «Святы Данат коскі точыць».

**25. п. Прокл.** Засцерагаліся вялікіх рос. ***Якуб.*** «На Якуба хлеба поўна губа».

**26. а. Гаўрылей.** Засцеражэнне ад граду. ***Ганна.*** «Снапы кладзе».

**29. пт. Афінаген.** Заціхаюць птушкі.

**31. н. Серпавіца, Шыпілінка** (пятніца перад Ільёю). Дзень «зазубрывання» сярпоў.

## Жнівень

**1. п. Макрыны.** «Глядзі восень па Макрыні».

**2. а. Ілья.** Свята дажджоў і навальніц. «Ілья нарабіў гнілля», «Укінуў у ваду кусок ільда».

**4. ч. Мар'я.** «Магдалена — вады па калена».

**6. сб. Барыс.** «Барыс і Глеб — паспеў хлеб».

**7. н. Ганны.** «Святыя Ганны бабкі стаўляюць».

**9. а. Палікоп.** «Паліць копы». **Панцеляймон.** Вылечваў хваробы галавы.

**11. ч. *Лаўрын.*** «На Лаўрына спяшай да млына».

**12. пт. Сіла.** «Жыта сей».

**14. н. Макавей, Першы Спас.** Свята маку і мёду. **Спасаўка.** Пост да 28 жніўня.

**15. п. Базыль.** «Базыль авечкам воўну дае». ***Прачыстая, Зельная.*** «Прыйшла Прачыста — стала поле чыста».

**16. а. Антоны-віхравеі. Рох.** «Кірмаш на паненак».

**17. с. Еўдакія.** «Агуркі збірае».

**19. пт. Яблычны Спас.** Свята садавіны.

**23. а. Лаўрэн.** Свята млынара.

**24. с. *Баўтрамей.*** «Св. Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей». «Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей».

**27. сб. Міхей.** Выспяваюць брусніцы.

**28. н. Прачыстая.** Свята ўраджаю.

**29. п. Трэці Спас.** Свята хлеба. **Ян.** «Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў».

**30. а. Міроны-ветрагоны.** «Пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць».

**31. с. Флор і Лаўр.** Свята коней. Арабінавыя дзень і ноч. «Сухая» навальніца, дождж.

## Верасень

**5. п. Лупа.** «Сей на Лупа — будзе жыта купа».

**7. с. Баўтрамей.** «Жыта на зіму сей».

**8. ч. *Другая Прачыстая.*** «Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста».

**10. сб. Мацей** — абаронца ад п'янства.

**11. н. Калінавік, Іван Крываўнік.**

**13. а. Кіпрыян.** Журавель збіраецца ў вырай.

**14. с. Сымон.** Абрад «жаніцьбы коміна». (Асенняе навалецце з 1493 года). Закрыванне зямлі. Бабіна лета. ***Узвіжанне.***

**19. п. Цуды, Міхал.** «Міхал з поля спіхаў».

**21. с. Багач, Нараджэнне Божай Маці.** Свята заканчэння ўборкі збожжавых. Засідкі.

**24. сб.** Асенняе раўнадзенства. Усход — 7.00, захад — 19.02.**Тадора.** «На Тадору ўсякае лета заканчваецца».

**26. п. Стаўроўскія Дзяды.**

**27. а. Звіжанне.** Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі — у кучу.

**29. ч. *Міхал.*** «Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі». ***Сіцыян.*** «Святы Сацыян да ляны пасцілаў».

## Кастрычнік

**2. н. Зосім.** Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.

**3. п. Астап, Астаф'я.** Прыкметы па ветры.

**4. а. *Пранцішак, Францішак.*** «На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка».

**8. сб. Сяргей.** Жалезны тыдзень.

**9. н. Іван Шаптун, Іван Кураед, Багаслоў.** Шапталіся свахі пра нявест.

**14. пт. Пакровы, Трэцяя Прачыстая.** Вясельная пара. «Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам». «Пакровы — зарыкалі каровы». Дзявоцкае лета (па 21.10). Прымалі «ў дзеўкі» сябровак.

**21. пт. Трыфан, Палагея.** «Золкім ветрам вее». ***Зміцер.*** «Да Змітра баба хітра».

**25. а. Марцін.** Свята млынароў.

**28. пт. *Сымон і Юда.*** «Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць». ***Параскева Пятніцкая.*** Забарона на прадзенне.

**29. сб. Лонгін.** Збавіцель ад хвароб вачэй.

**30. н. Паклоны.** Дзень адбівання паклонаў.

**31. п. Лука.** «Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі». Дзень іканапісцаў. ***Юльян*** — ахоўнік дзяцей.

## Лістапад

**1. а. *Усе святыя.*** Памінальны дзень.

**2. с. *Задушны дзень.*** Памінальны дзень.

**4. пт. Казанская.** Дождж ці снег.

**5. сб. Асяніны, Змітраўскія Дзяды.** «Святыя дзяды, завём вас...»

**8. а. Зміцер.** «Да Змітра дзеўка хітра». Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.

**9. с. *Тодар.*** «На Тадора поўна камора».

**10. ч. Параскі.** Апякунка жанчын і рукадзелля.

**11. пт. Настуся.** «Настуся стрыжэ авечкі». ***Марцін.*** «Мядзведзь кладзецца ў бярлогу».

**12. сб. Артошка.** Пачатак прадзення.

**14. п. Кузьма-Дзям'ян** — апякун земляробства, кавалёў і вяселля.

**21. п. Міхайлаў дзень** — абаронца ад грому. Мядзведзі ідуць у спячку.

**22. а. Матрона.** «З Матроны становіцца зіма».

**24. ч. Хведар-студзянец.** «Хведаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць».

**25. пт. Іван Міласцівы.** Дзень падарункаў. ***Кацярыны.*** «Кацярына забрала лета».

**27. н. Юстыніян** — апякун плоднасці і дзяцінства. ***Адвент.*** Перадкалядны пост. **Піліп**. Пярэдадзень Піліпаўскага посту (да 7 студзеня).

**28. п. Піліпаўка** — перадкалядны пост.

**29. а. Мацей.** «На Мацея зіма пацее».

**30. *с. Андрэй.*** Дзявочае свята.

## Снежань

**4. н. Увядзенне.** Водзяцца ваўкі. ***Барбара.*** «Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла».

**5. п. Пракоп. *Савы.*** «Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае».

**6. а. Матрыхваны.** Не пралі. ***Мікола.*** «Хвалі зіму па Міколе».

**7. с. Кацярыны.** «Забрала край лета».

**9. пт. Юр'е Зімовы.** «Юра мосціць». ***Ганны.*** «Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні».

**13. а. Андросы, Андрэйкі.** Варажылі.

**14. с. Навум.** Наставіць на вум.

**17. сб. Варвары.** «Мікола і Варвара ноч урвалі».

**18. н. Савы.** «Сава мосце, а Мікола гвоздзе».

**19. п. Мікола Зімовы.** «Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета». «Мікола марозам гвоздзіць». Усход — 9.25, захад — 16.49. Зімовае сонцастаянне з 19.12 да 22.12.

**22. ч. Ганны.** «Ганкі — сядайце на санкі».

**24. сб. *Посная куцця.***

**25. н. Спірыдон-сонцаварот. *Божае Нараджэнне.***

**26. п. *Сцяпан.*** «Кожны сабе пан».

**31. сб. Марк.** «Марка да Варка — няхай будзе парка». ***Багатая куцця. Сільвестр.*** Варажылі дзяўчаты.

**Складальнік Алесь ЛОЗКА.**

■ Звярніце ўвагу

# МІКРАПЛАСТЫК: НЯБАЧНАЯ ПАГРОЗА

## Як невялікія гранулы трапляюць з вады да нас на стол?



**Набываючы скраб альбо крэм для адлушчвання скуры ці гель для душу з «застылымі» рознакаляровымі часцінкамі мікрапластыку, мы наўрад ці задумваемся, якую шкоду здольны нанесці гэтыя «кругляшы» навакольнаму асяроддзю. Нядаўна было апублікавана навуковае даследаванне аб знаходжанні сінтэтычных палімераў у арктычных водах. Спецыялісты непакояцца: ёсць верагоднасць, што з вадой Сусветнага акіяна рэчыва трапіла ў харчовы ланцужок і, верагодна, можа з'явіцца і на нашым стале. Аб пагрозах і сітуацыі з мікрапластыкам у Беларусі гутарылі эксперты на мерапрыемстве, арганізаваным установай «Цэнтр экалагічных рашэнняў» (ЦЭР).**

### НЕБЯСПЕЧНАЯ «ГУБКА»

Дробныя часцінкі пластыку розных відаў (а гэта і ёсць мікрапластык) выкарыстоўваюцца ў шампунях, дэзадарантах, памадзе, тушы. Яны адлушчваюць скуру, «размываюць» маршчынкі, фіксуюць фрызуру і нават могуць служыць дэкаратыўным элементам — бліскучкамі ў лаку для валасоў. Сінтэтычныя палімеры дзейнічаюць як назапашвальнікі, убіраючы ў сябе вітаміны ды мікраэлементы. У параўнанні з натуральнымі адпаведнікамі мікрапластык не надта дарагі, таму шырока выкарыстоўваецца ў вытворчасці касметыкі. Праблемы пачынаюцца, калі касметычны сродак з сінтэтычнымі палімерамі змываецца вадой і трапляе ў каналізацыю. Адфільтраваць мікрапластык немагчыма проста з прычыны таго, што рэчыва вельмі маленькае — максімум 5 мм у дыяметры. Мы нават можам не заўважыць непрыкметныя гранулы.

Трапіўшы ў ваду, мікрапластык становіцца сапраўднай пагрозай. Па-першае, ён не раскладаецца. Мікрапластык захоўвае здольнасць назапашваць рэчывы, але на гэты раз убірае ў сябе не вітаміны, а бактэрыі і розныя арганічныя спалучэнні, сярод якіх могуць аказацца і ўстойлівыя арганічныя забруджвальнікі. Жыхары вадаёмаў часта прымаюць прывабныя часцінкі за ежу. Даследаванні па ўздзеянні мікрапластыку на зоапланктонаў паказалі: рэчыва трапляе ў страўнікава-кішачны тракт альбо ў тканку і не выводзіцца з арганізма. Мікрапластык становіцца звяном харчовага ланцужка: неаднаразова рэгістраваліся выпадкі, калі ён быў знойдзены ў малюсках і марской солі. Такім чынам, непрыкметныя гранулы пачынаюць свой шлях ад упакоўкі з касметычным сродкам і заканчваюць у нас на стале.

Дарэчы, існуе яшчэ і другасны мікрапластык, які ўтвараецца з пластыкавага смецця, раздробненага да мікрагранул.

**Кандыдат тэхнічных навук, дацэнт кафедры «Водазабеспячэнне і водаадвядзенне» Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Міхаіл АНУФРЫЕЎ** адзначыў, што ў Беларусі мікрапластык як забруджвальнае рэчыва ў сцёкавых водах не нарміруецца. Яго немагчыма затрымаць на звычайных фільтрах.

### ЦІ ЁСЦЬ ПАГРОЗЫ АД КАСМЕТЫКІ?

— За мінулы год беларусы выкарысталі больш за дзве тоны мікрапластыку, — заўважыла **кіраўнік праграмы па экалагічна дружалюбным ладзе жыцця ЦЭР Дар'я ЧУМАКОВА.**

Прычым у самім сродку можа быць ад 10 да 90% сінтэтычных палімераў. У склад класічнага крэму для адлушчвання скуры ўваходзіць столькі мікрапластыку, колькі месяцаў яго ў сабе сама ўпакоўка прадукту. У Беларусі сітуацыю ратуе малое спажыванне касметыкі з мікрапластыкам. Іншыя краіны пазначылі сінтэтычныя палімеры як праблему: у амерыканскім штаце Ілінойс касметыка, якая месціць у сабе мікрапластык, афіцыйна забаронена. У Еўропе забароны на яго выкарыстанне ў касметычна-парфумерней прадукцыі толькі пачынаюць абмяркоўвацца.

— Уся касметыка, якая трапляе на прылаўкі беларускіх крам, праходзіць праверку адпаведнасці нарматыўна-прававым актам. У ёй адсутнічае раздражняльнае ўздзеянне на скуру і слізістыя, агульнатаксічнае ўздзеянне на арганізм. Мікрапластык не ўключаны ў спіс забароненых альбо абмежаваных да выкарыстання рэчываў, якія ўваходзяць у склад парфумерна-касметычнай прадукцыі, дазволенай да рэалізацыі на тэрыторыі Мытнага саюза, — адзначыла **старшы выкладчык кафедры гігіены і медыцынскай экалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ірына МАШЧАНКА.** — Касметычныя сродкі, якія змяшчаюць у сабе мікрапластык, кантактуюць са скурай нядоўга, хутка змываюцца, а значыць рэальнай пагрозы не нясуць, бо мікрапластык нераствaральны і ўздзейнічаць на скуру не можа. Аднак пры няправільным захоўванні касметычнага сродку, напрыклад перавышэнні тэмпературы альбо парушэнні тэрмінаў захавання, з яго могуць выдзяляцца патэнцыйна небяспечныя рэчывы (пластыфікатары, фталаты і г. д.).

У якасці альтэрнатывы эксперт прапануе карыстацца арганічнай касметыкай альбо шукаць сродкі, у якіх сінтэтычныя палімеры заменены на натуральныя рэчывы: костачкі абрыкоса, маліны, валокны люфы.

Для вывучэння ўздзеяння мікрапластыку на воды, арганізм чалавека і жывёльны свет неабходны дадатковыя навуковыя даследаванні.

### ЯК ЗНАЙСЦІ МІКРАПЛАСТЫК НА ЭТЫКЕТЦЫ?

Ён можа хавацца пад рознымі назвамі — поліэтылен (polyethylen, PE), поліпрапілен (polypropylen, PP), поліэтылентэрэфталат (polyethylenterephtalat, PET), поліамід (polyamide Нейлон-12 (nylon-12), Нейлон-6 (nylon-6), Нейлон-66 (nylon-66), PA), поліўрэтан (polyurethan, поліўрэтан-2, поліўрэтан-14, поліўрэтан-35, PUR), акрылат сапалімер (acrylates copolymer, AC), полікватэрніум (polyquaternium, P), полістырол (polysterene, PS).

**Кацярына РАДЗЮК.**

*radziuk@zviazda.by*

■ Друкуецца ў «Алесі»

# НОВАЯ ELEMA АД ІВАНА АЙПЛАТАВА

**Навіна аб тым, што год таму кампанія «Элема» запрасіла Івана Айплатава ў якасці крэатыўнага дырэктара, гучна абмяркоўвалася ў прэсе. Але здаецца, што можа быць больш лагічным, калі буйное прадпрыемства па пашыве адзення звяртаецца да прафесійнага дызайнера? Першае, што вядомы беларускі мадэльер зрабіў на новай пасадзе, — гэта рэбрэндынг і стварэнне новых калекцый кампаніі. Карысны вынік ад цеснага супрацоўніцтва — відавочны. Беларуская «Элема» нараўне з вядомымі дызайнерамі паспяхова прадставіла свой брэнд, а менавіта калекцыю «Вясна-2016» — на Маскоўскім тыдні моды.**





Беларускія паліто ўразілі не толькі глядзельную залу, дзе ішоў паказ мадэляў, але і наведвальнікаў шоу-рума. Яркія прадстаўніцы маскоўскага бамонду Эвеліна Блёданс, Алеся Судзілоўская, Алена Захарава не толькі з задавальненнем прымералі модныя навінкі ад Івана Айплатава, але і сталі першымі ўладальніцамі беларускіх паліто новага сезона. Дарэчы, у хуткім часе ў Маскве адкрыюцца тры фірменныя крамы Elema.

Каб гучна заявіць аб сабе па-за межамі краіны, прадпрыемства ажыццявіла шэраг змяненняў. Лагатып Elema прыняў лацінскае аблічча і ўвасобіўся ў стрыманай бежавай гаме. Гэта колер элегантнасці, статуснасці, шыку. Сёння Elema — не проста швейная фабрыка. Гэта кампанія, якая выпускае сучаснае якаснае адзенне на любы густ.

Дарэчы, брэнд разлічаны на вялікую аўдыторыю і мае тры лініі: «Elema Premium» — вопратка, якая выпускаецца абмежаванай колькасцю, але больш каштуе; «Elema Classic» — для жанчын 40+, якія выбіраюць стыльнае і сучаснае адзенне; «Elema Your Line» (лінія для моладзі) — адрозніваецца разнастайнасцю колераў, прынтаў і модных фасонаў.

Вядома, што Іван Айплатаў з не меншым задавальненнем стварае адзенне і для мужчын. Таму ў хуткім часе ў Elema з'явіцца і мужчынская лінія.

Elema выступае як кампанія па выпуску менавіта верхняй вопраткі. Мала хто ведае, што прадпрыемства раней выраблялa і летні асартымент. У апошні час яно не толькі вярнулася да гэтай практыкі, але і вырашыла падысці да выпуску сукенак, касцюмаў, спадніц па-сучаснаму — калекцыямі. Як паабяцаў Айплатаў, цяпер такая практыка стане рэгулярнай. Кампанія будзе прадстаўляць 4 новыя калекцыі ў год (па сезонах).

Якія модныя навінкі ад Elema і Івана Айплатава з'явяцца ў беларускіх магазінах ужо ў лютым 2016 года і іншыя цікавыя падрабязнасці супрацоўніцтва брэнда і вядомага беларускага дызайнера, чытайце ў інтэрв'ю з Іванам на старонках часопіса «Алеся» ў студзені.

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ**

**ТАКСАМА Ў НУМАРЫ «АЛЕСІ»:**

**— шчырая размова з Аляксандрам Рыбаком;**

**— кансультацыя юрыста пра тое, як правільна аформіць спадчыну;**

**— цікавыя парады іміджмейкера Алёны Санько для прыхільнікаў чырвонага колеру;**

**— даведаемся, навошта дарослым патрэбны «размалёўкі», і шмат іншага.**




■ Факт

## КВІТКІ НА ЦЯГНІКІ — ПА НОВАЙ ТЭХНАЛОГІІ

**Беларуская чыгунка ўкараніла новую тэхналогію набыцця электронных праязных дакументаў праз інтэрнэт. На сайце poezd.rw.by з'явіўся шэраг нававядзенняў, у тым ліку быў абноўлены яго інтэрфейс, пашыраны функцыянал атрымання інфармацыі аб раскладзе цягнікоў, змянілася форма бланка электроннага праязнога дакумента.**

Як расказалі ў прэс-цэнтры магістралі, кожнаму набытаму праз інтэрнэт білету цяпер прысвойваецца ўнікальны 14-значны нумар. Пасля аплаты электроннага праязнога дакумента фарміруецца яго бланк, у якім паказаны нумар заказу (14 знакаў) і нумар электроннага праязнога дакумента (14 знакаў). Калі ў заказе адзін білет, нумары заказу і электроннага праязнога дакумента супадаюць. Калі ж ён аформлены на двух-чатырох пасажыраў, нумары супадаюць толькі ў першага пасажыра ў заказе.

Цяпер у пасажыраў з'явілася больш магчымасцяў кіраваць сваімі заказамі. Напрыклад, у новай версіі сістэмы продажу можна выконваць або адмяняць электронную рэгістрацыю ў асабістым кабінеце (не пазней, чым за адну гадзіну да адпраўлення з пачатковай станцыі маршруту руху) як адначасова для ўсіх указаных у заказе пасажыраў, так і асобна для кожнага з іх. Пры гэтым у бланку электроннага білета паказваецца час, да якога магчымая адмена электроннай рэгістрацыі.

Апроч таго, на сайце чыгункі з'явіўся раздзел «Зніжкі», у якім можна азнаёміцца са зніжкамі на праезд, што прадастаўляюцца магістраллю.

## НАВАГОДНІЯ СЮРПРЫЗЫ... АД ДАІ

**Школьнікам, якія пацярпелі ў дарожна-транспартных аварыях на тэрыторыі Партызанскага раёна сталіцы, у дні зімовых канікул паштальён прынясе дадому віншавальныя паштоўкі, тэматычныя дзіцячыя кніжкі, плакаты і святлоадбівальныя элементы.**

— Такія віншавальныя пісьмы супрацоўнікі нашага аддзела падрыхтавалі для дзяцей, якія атрымалі траўмы ў дарожна-транспартных здарэннях цягам гэтага года. На шчасце, цяпер іх здароўю нічога не пагражае, — расказала **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.**

Апроч таго, напярэдадні супрацоўнікі наведалі ўсе навучальныя ўстановы раёна, павіншавалі школьнікаў з навагоднімі святамі, а таксама нагадалі ім аб бяспечных паводзінах на вуліцы і неабходнасці выконваць Правілы дарожнага руху.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ДАЛЁКА НА ПОЎДЗЕНЬ



## Чым прываблівае суровая Антарктыда?

**Адным з найменш вывучаных рэгіёнаў Зямлі лічыцца яе Паўднёвы полюс — Антарктыда. Даследаванні і адкрыцці, праведзеныя дагэтуль на кантыненце, пакідаюць яшчэ больш пытанняў. Гэта адзіная тэрыторыя на нашай планеце, якая не належыць ніводнай з дзяржаў. Разам з тым, з кожным годам яна прыцягвае да сябе ўсё больш увагі з боку многіх краін. Чым жа так прывабная вялізная тэрыторыя, амаль цалкам пакрытая вечным лёдам?**

### АСКЕПКІ ГАНДВАНЫ

Спачатку крыху самых агульных звестак. Антарктыда — кантынент на самым поўдні Зямлі. Гэта мацярык, які амываюць Ціхі, Атлантычны і Індыйскі акіяны (часам усе гэтыя часткі воднай прасторы вызначаюць як асобны Паўднёвы акіян). Плошча шостага кантынента складае больш чым 14 мільёнаў кв. км — самая вялікая ў свеце халодная пустыня, дзе засяроджана каля 80 працэнтаў сусветных запасаў прэснай вады, але ўся яна ў змерзлым стане складзена ў велізарным ледавіковым покрыве. Хоць карэнная падлёдная паверхня знаходзіцца на невялікай вышыні над узроўнем мора, а месцамі і ніжэй за яго, праз магутнае ледавіковае покрыва сярэдняя абсалютная вышыня паверхні Антарктыды (каля двух кіламетраў) — максімальная сярод усіх мацерыкоў.

Трансантарктычныя горы, што перасякаюць амаль увесь мацярык, дзеляць Антарктыду на дзве часткі — Заходнюю і Усходнюю, якія маюць рознае паходжанне і геалагічную будову. На ўсходзе знаходзіцца высокае (найвялікшае ўзвышэнне паверхні лёду — 4,1 км над узроўнем мора), пакрытае лёдам плато. Заходняя частка складаецца з групы гарыстых астравоў, злучаных паміж сабой лёдам. На ціхаакіянскім узбярэжжы размешчаны Антарктычныя Анды, дзе знаходзіцца найвышэйшая кропка кантынента: 4892 м над



узроўнем мора — масіў Вінсон у гарах Элсуорт. У Заходняй Антарктыдзе знаходзіцца і самае глыбокае месца кантынента — упадзіна Бэнтлі, яе глыбіня 2555 м.

Антарктычныя ледзяны шчыт з'ўляецца самым вялікім на нашай планеце (для параўнання: ён амаль у дзесяць разоў перавышае па плошчы грэнландскае покрыва). Тут засяроджана каля 30 млн кв. км лёду — 90% усіх ільдоў сушы. З-за яго цяжару, як сведчаць даследаванні геафізікаў, кантынент асеў у сярэднім на паўкіламетра, аб чым сведчыць і яго адносна глыбокі шэльф. Цікавы факт: калі поўнасцю растане ледавіковае покрыва шостага кантынента, то ўзровень Сусветнага акіяна павялічыцца амаль на 60 метраў!

Сярэдняя таўшчыня пласта лёду — 2500—2800 м і ў некаторых раёнах 4800 м. Усходняя Антарктыда ўяўляе з сябе даўнейшую дакембрыйскую кантынентальную платформу (кратон), якая нагадвае такія ж падмуркі Індыі, Бразіліі, Афрыкі і Аўстраліі. Усе гэтыя кратоны ўтварыліся пры распадзе легендарнага суперкантынента Гандваны. Узрост парод крышталічнага падмурка складае 2,5—2,8 млрд гадоў, а найстаражытнейшыя пароды Зямлі Эндэрбі — больш за 3 млрд.

Антарктыда адрозніваецца вельмі суровым халодным кліматам. На савецкай антарктычнай станцыі «Усход» 21 ліпеня 1983 года была



зарэгістравана самая нізкая тэмпература паветра на Зямлі за ўсю гісторыю метэаралагічных вымярэнняў: 89,2 градуса ніжэй за нуль. Гэты раён лічыцца полюсам холаду нашай планеты. Сярэднія тэмпературы зімовых месяцаў — ад мінус 60 да 75 °С, а летніх — ад мінус 30 да 50 °С. На ўзбярэжжы цяплей: узімку — ад мінус 8 да 35 °С, а летам уже амаль «гарачыя» 0 — плюс 5 °С. Варта адзначыць, што зімовымі месяцамі ў Антарктыдзе (як і ва ўсім паўднёвым паўшар'і) з'яўляюцца чэрвень, ліпень і жнівень, а летнімі — снежань, студзень і люты.

### ЗЯМНЫ «КОСМАС»

Да пачатку XIX стагоддзя на нашай планеце па-ранейшаму заставалася нямала куткоў, дзе не ступала нага чалавека. Здавалася б, мінулі Вялікія геаграфічныя адкрыцці: апошні трыумф вандроўнікаў — адкрыццё Аўстраліі — адбыўся ў 1606 годзе. Пра тое, што недзе за Паўднёвым палярным кругам ляжыць невядомая зямля, людзі падазравалі яшчэ ў XVI стагоддзі. Вось толькі даплысці да яе не атрымлівалася: занадта суровыя былі кліматычныя ўмовы, ды і караблі тады будаваліся не самыя моцныя.

На доўгія гады крайнім пунктам для многіх няўрымслівых вандроўнікаў заставаўся субантарктычны востраў Паўднёвая Георгія.

Паспрабаваць адкрыць «тэра інкогніта» хацеў і легендарны Джэймс Кук. Яму гэта зрабіць не ўдалося — заміналі шматгадовыя льды, хоць знакаміты капітан і працягваў верыць у існаванне шостага кантынента. У 1819 годзе адмірал Іван Крузенштэрн накіраваў у Марское міністэрства Расійскай імперыі ліст, у якім заявіў пра неабходнасць падрыхтоўкі экспедыцый для дасягнення Паўднёвага і Паўночнага полюсаў. Паўднёвага павінны былі дасягнуць шлюпы «Мірны» і «Усход». Першым камандаваў лейтэнант Міхал Лазараў, а другім — капітан другога рангу Фадзей Белінсгаўзен. 28 студзеня 1820 года гэтая экспедыцыя адкрыла шосты кантынент нашай планеты. А высадка людзей у Антарктыдзе адбылася значна пазней — у 1895-м.

Антарктыда на сённяшні дзень з'яўляецца адзіным незаселеным і неасвоеным кантынентам Зямлі. Яна даўно прыцягвала ўвагу шэрага дзяржаў, аднак пік «папулярнасці» прыпаў на другую палову XX стагоддзя. Чаму так адбылося? Справа ў тым, што, як аўтарытэтна сцвярджаюць спецыялісты, Антарктыда з'яўляецца апошнім рэсурсавым рэзервам для чалавецтва. Пасля вычарпання сыравіны на пяці абжытых кантынентах людзі будуць актыўна асвойваць яго рэсурсы. Геолагі высветлілі, што нетры Антарктыды ўтрымліваюць значную колькасць карысных выкапняў: жалезнай руды, каменнага вугалю, знойдзены сляды руд золата, срэбра, медзі, нікелю, свінцу, цынку, малібдэну, горнага крышталю, графіту. Найбольш перспектыўным па радовішчах металаў лічыцца Антарктычны паўвостраў, бо вялікая частка яго паверхні вольная ад лёду.

Па здабычы нафты найбольш прывабны — антарктычны кантынентальны шэльф у заходнім і ўсходнім сектарах. Па ацэнцы расійскіх геолагаў, патэнцыйна агульны аб'ём вуглевадароднай сыравіны, што знаходзіцца на шэльфе, 35—51 млрд тон умоўнага паліва. Як сцвярджаюць асобныя крыніцы, сапраўдны «клондайк» — мора Роса, дзе могуць знаходзіцца найбуйнейшыя запасы нафты, што саступаюць па аб'ёмах толькі Саудаўскай Аравіі.

Апроч таго, у Антарктыдзе знаходзіцца большасць сусветных запасаў прэснай вады, недахоп якой ужо адчуваецца ў многіх краінах. Праўда, праекты па выкарыстанні антарктычных айсбергаў як водных рэсурсаў пакуль застаюцца на эксперыментальнай стадыі. З пункту гледжання эканомікі цяпер найлепшыя перспектывы мае турыстычны бізнес. Упершыню круізныя судны з'явіліся каля берагоў мацерыка напрыканцы 1950-х.

Узбярэжныя воды шостага кантынента багатыя на рыбу. Сёння самыя буйныя рыбацкія флатыліі, што аперуюць у Антарктыды, належаць Японіі і Чылі. Кітабойным промыслам у антарктычных водах сёння займаюцца толькі японцы, якія заяўляюць, што робяць гэта «выключна з навуковымі мэтамі». Іншай патэнцыйна перспектыўнай эканамічнай актыўнасцю можа стаць так званая біяразведка. Гэты кірунак афарміўся паераўнальна нядаўна. Навукоўцам-біёлагам даўно вядомы той факт, што некаторыя віды рыб, нехрыбтовых і бактэрый, што насяляюць Антарктыку, утрымліваюць адметныя рэчывы і мікраарганізмы, якія засцерагаюць іх ад замярзання. Такія рэчывы маглі б быць скарыстаны пры вытворчасці, напрыклад, марожанага ці іншых тыпаў замарожаных прадуктаў. Апроч адпаведнай індустрыі, холадатрывалыя мікраарганізмы знаходзяць прымяненне ў распрацоўках фармакалагічных прэпаратаў новага пакалення.

Антарктыда — кліматычны запаведнік і ідэальнае месца для даследавання глабальных працэсаў змены клімату. Шосты кантынент, як, напрыклад, Гальфстрым у Паўночным паўшар'і, з'яўляецца кліматаўтваральным фактарам для ўсёй Зямлі. У Антарктыдзе таксама вывучаецца ўплыў космасу і працэсы, што адбываюцца ў зямной кары. У ледавіковым покрыве Антарктыды «запісаны» даныя пра клімат і атмасферу за апошнія сто тысяч гадоў.

### НАПЯРЭДАДНІ БІТВЫ?

Ужо ў другой палове XX стагоддзя — 1 снежня 1959-га — у Вашынгтоне была складзена «Дамова пра Антарктыду». Паводле гэтага міжнароднага пагаднення, шосты кантынент ці яго часткі не належаць якой-небудзь дзяржаве. Забаронена з'яўленне паўднёвей 60-й паралелі ваенных караблёў, дазваляецца навуковая дзейнасць і вольны абмен атрыманымі вынікамі. У 1980-х да гэтага далучылася забарона на з'яўленне ў водах Антарктыды суднаў з атамнымі рэактарамі і пахаванне на яе тэрыторыі ядзерных адходаў.



**Геолагі высветлілі, што нетры Антарктыды ўтрымліваюць значную колькасць карысных выкапняў: жалезнай руды, каменнага вугалю, знойдзены сляды руд золата, срэбра, медзі, нікелю, свінцу, цынку, малібдэну, горнага крышталю, графіту.**

Дадатковы дакумент пра забарону на здабычу карысных выкапняў — так званы Мадрыдскі пратакол. У адрозненне ад першай дамовы, якая з'яўляецца бестэрміновай, гэтае пагадненне дзейнічае цягам паўстагоддзя. Падпісалі яго ў 1991-м, уступіў у дзеянне ў 1998 годзе. Атрымліваецца, што Мадрыдскі пратакол правамоцны да 2048-га.

Сітуацыя ўскладняецца тым, што дзевяць краін паспелі належным чынам афарміць свае прэтэнзіі на кавалак Антарктыды да ўступлення ў дзеянне дамовы ад 1959 года. Праўда, Германія і Японія ад сваіх планаў вымушаны былі адмовіцца, але засталіся яшчэ Аўстралія, Аргенціна, Вялікабрытанія, Новая Зеландыя, Нарвегія, Францыя і Чылі. Гэтыя краіны прэтэндуюць на ладныя кавалкі паўднёвага мацерыка, прычым прэтэнзіі Аргенціны, Чылі і Вялікабрытаніі часткова перасякаюцца. Расія і ЗША не прызналі прэтэнзій іншых, але і сваіх не вылучылі, хоць адзначылі, што могуць гэта зрабіць у любы момант.

Па ацэнках, запасы прэснай вады на Зямлі могуць падысці да канца да 2033 года. Нафты і газу хопіць яшчэ на паўстагоддзя. А значыць, нетры і багацці Антарктыды ўжо вельмі хутка стануць крытычна запатрабаванымі. Пакуль шосты кантынент застаецца запаведнікам і базай для навуковых даследаванняў. Аднак, як лічаць эксперты, усяго праз пару дзесяцігоддзяў можа распачацца сапраўдная міжнародная бітва за Антарктыку.

**Захар БУРАК.**

Ігуменскі тракт
№ 46 (147)

■ Свет і мы

# ЗАХАВАЦЬ НЕЛЬГА ЎРАТАВАЦЬ

## Калі спадчына аказваецца пад пагрозай знішчэння

**Народы губляюць свае скарбы па-рознаму: занядбанне, руйнаванне няўмольным часам, забыццё. Але асаблівая бяда напаткала сірыйскую культуру. У выніку бамбёжак былі знішчаны некаторыя ўнікальныя помнікі сусветнай культуры, унесеныя ў спіс спадчыны ЮНЕСКА. І хоць цяпер гінулі не людзі, а камяні, гэта, нібы ў люстэрку, паказала ўсю абсурднасць таго, што адбываецца навокал... Пра тое, якія культурныя страты панесла Сірыя, можна было даведацца на фотавыставе, што праходзіла ў Нацыянальным мастацкім музеі і называлася «Скарбы сірыйскіх помнікаў — спадчына ўсяго чалавецтва».**

### «Страта агульначалавечых каштоўнасцей»

— Нашы культурныя каштоўнасці пад пагрозай знішчэння, — адзначыў з нагоды адкрыцця выставы **міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ**. — Тое, што захавалася ў Сірыі, з'яўляецца ўвасабленнем працы тых, хто служыў Богу. Гэта ўспаміны, якія павінны застацца, каб цывілізацыя не спынялася і працягвала сваё развіццё. Выстава фотаздымкаў з выявамі Сірыі, размешчаная ў нас, сведчыць пра тое, што мы паважаем вечныя агульначалавечыя каштоўнасці, якія ніхто не мае права знішчаць ці змяняць.

Шматлікія архітэктурныя помнікі: палацы і плошчы, базары, мячэці і цэрквы і нават цэлыя старажытныя гарады — усё гэта сведчыла пра вялізныя культурныя дасягненні сірыйцаў. Да нядаўняга часу сюды можна было прыехаць, каб на свае вочы ўбачыць тое, з чаго пачыналіся першыя цывілізацыі. Аднак цяпер... Журналісты і фатографы сутыкаюцца з вялікімі цяжкасцямі, каб адлюстраваць тыя страты, якія панесла архітэктура.

### Згаслае ззянне Пальміры

Фотавыстава, арганізаваная Пасольствам Сірыйскай Арабскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, пабудавана такім чынам, каб можна было ўбачыць, як выглядалі



культурныя каштоўнасці і што з ім стала цяпер. На здымках паўсюдна відаць дзіркі ад снарадаў, знесеныя кавалкі сцен, колішнія славутасці выглядаюць занядбанымі. Некаторых цэркваў не стала зусім. У адной з самых старажытных мячэцяў абрынуўся купал.

Горад Пальміра з'яўляўся перлінай сірыйскай культуры, быў адным з найбагацейшых у часы позняй Антычнасці. Ён прызнаны ЮНЕСКА помнікам сусветнай спадчыны. Уздоўж галоўнай вуліцы размяшчаліся каланады і манументальныя аркі. Сярод найбольш значных збудаванняў храм Бэла (I стагоддзе), храм Баалшаміна (II стагоддзе), агора (III стагоддзе), тэатр з грамадскім цэнтрам і караван-хлеў.

**Як дамы, у якіх ніхто не жыве, разбураюцца значна хутчэй, так і помнікі, пра якія ніхто не дбае, паступова руйнуюцца. Быццам адчуваюць, што пра іх забыліся.**



Басам Абдуль МАДЖЫД і Барыс СВЯТЛОЎ на адкрыцці выставы.

У маі гэтага года Пальміру захапілі вайскоўцы «Ісламскай дзяржавы». Многія помнікі, якія не былі вывезены ўладамі, разрабавалі ці знішчылі. Што застанецца ад гэтага цэнтра антычнай культуры, застаецца толькі здагадвацца...

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Сірыйскай Арабскай Рэспублікі ў Беларусі Басам Абдуль МАДЖЫД** адзначыў:

— Мы дэманструем помнікі ў мірны час і развалiны — тое, што засталося пасля бамбёжак. Фізічна немагчыма паказаць велізарныя маштабы разбурэнняў — школ, музеяў, гарадоў, хіба што са спадарожнікаў. Вайна — гэта вораг гістарычных каштоўнасцей, і мы выказваем падзяку Беларусі за падтрымку нашай краіны, за гуманітарную дапамогу, якую яна аказвае Сірыі на шляху да міру.

Чаго могуць дамагацца тыя, хто знішчае культурныя помнікі? Найперш забыцця. Каб сцёрлася памяць. Каб народ больш не ідэнтыфікаваў сябе як спадкаемца тых, хто мысліў велічна і ўвасабляў задуманае ў жыццё. Народы-захопнікі зайздросцяць культуры тых, на каго нападаюць, бо яна для іх недасяжная...



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

### Калыска сусветных здабыткаў

Менавіта Сірыю называюць «калыскай цывілізацый», бо тут зарадзіліся самыя старажытныя гістарычныя культуры. У розныя перыяды на сірыйскай зямлі жылі шумеры, акадцы, халдзеі, ханаанейцы, арамейцы, хеты, вавіланяне, персы, грэкі, рымляне, набацеі, візантыйцы, арабы, туркі. Сірыя — калыска семіцкіх моў, асновай якіх лічыцца арамейская мова. Менавіта на ёй гаварыў сам Ісус Хрыстос. Але і да гэтага часу жыхары асобных раёнаў Сірыі размаўляюць па-арамейску.

Сірыя — радзіма першага алфавіта і першай ноты ў гісторыі чалавецтва, першай бібліятэкі, плуга і першага сродку перамяшчэння, а таксама глінянага посуду, люстэрка і лаўровага вянка пераможцы...

***

Некаторыя народы страчваюць свае каштоўнасці праз ваеннае ўмяшальніцтва. Аднак міжволі думаецца пра тое, што, калі не клапаціцца пра тую спадчыну, якая ёсць у сваёй краіне, яна таксама можа загінуць. Як дамы, у якіх ніхто не жыве, разбураюцца значна хутчэй, так і помнікі, пра якія ніхто не дбае, паступова руйнуюцца. Быццам адчуваюць, што пра іх забыліся.

Сірыйцы заўсёды жылі побач з Пальмірай і ганарыліся старажытным горадам, аднак у адзін момант усё змянілася і ён трапіў пад пагрозу знішчэння. Ці не час і нам задумацца пра больш пільны клопат аб сваёй гісторыка-культурнай спадчыне, пакуль яе не зруйнаваў час?..

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

■ Для памяці

# МІКАЛАЙ МАГІЛЬНЫ. КРУГ ЖЫЦЦЯ



30 снежня 2015 года пайшоў з жыцця чалавек, лёс якога быў напоўнены многімі выпрабаваннямі. Мікалай Васільевіч Магільны... Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, журналіст, выкладчык інстытута фізкультуры. Неардынарны чалавек у сваіх памкненнях зрабіць жыццё цікавым і насычаным. Многім мінчанам ён вядомы як калекцыянер прадметаў побыту і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Яго невялікая гарадская кватэра была застаўленая не толькі старадаўнімі кніжнымі фаліянтамі, але і ганчарнымі, і металічнымі вырабамі, рознымі прадметамі з саломы і дрэва. На працягу многіх гадоў Магільны збіраў кулоны, медальёны, пацеркі, гузікі. Шмат што са сваіх збораў апантаны калекцыянер, чалавек, які імкнуўся і ў сваёй свядомасці, і ў сваёй кватэры, і на лецішчы ў Пухавіцкім раёне захаваць партрэты розных часін, перадаў у музеі Гродна, Нясвіжа, Заслаўля і іншых вялікіх і малых паселішчаў. Пра калекцыю Магільнага і пра тое, як яна складалася на працягу многіх дзесяцігоддзяў, можна было б напісаць асобную кнігу.

А яшчэ ж была ў яго лёсе вайна... Нарадзіўся Мікалай Васільевіч 3 чэрвеня 1920 года ў горадзе Марыупаль Украінскай ССР. Да вайны паспеў закончыць Харкаўскае ваеннае медыцынскае вучылішча. Перад самым пачаткам драматычных падзей быў накіраваны ў Брэсцкую крэпасць. Ваяваў, трапіў у палон, партызаніў, ізноў аказаўся ў дзеючай арміі... Адзнакі яго воінскай доблесці — ордэны Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, два ордэны Айчыннай вайны — 1-й і 2-й ступеняў, медалі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» 1-й і 2-й ступеняў. Пра сваю партызанскую адысею Мікалай Васільевіч напісаў шчырую спавядальную кнігу — «Тугай». Чытаецца яна на адным дыханні і падаецца значна цікавейшай, чым шмат якія «сухія», пазбаўленыя жывога жыцця мемуары...

**Сяргей ШЫЧКО**

■ Знаходка

# АРТЭФАКТ ПРАЗ ТЫНКОЎКУ

**Графіці можа стаць адным з унікальных экспанатаў у знакамітым будынку, дзе выкладалі Шагал, Малевіч, іншыя вядомыя мастакі.**

«Звязда» летам паведамляла. што падчас рэстаўрацыі віцебскага будынка на сцяне знайшлі аўтограф Заіра Азгура, зроблены вугельчыкам. Цяпер новая сенсацыйная знаходка: на адной са сцен знайшлі чарговы артэфакт.

— Літару «У» зробленую такім жа шрыфтам, як і назва УНОВІС, пад верхнім слоем атынкоўкі знайшлі напярэдадні каталіцкага Раства. Я пачысціў далей і ўбачыў яшчэ літары. Што дакладна напісана, пакуль незразумела. Але ў любым выпадку знаходка каштоўная. Як і аўтограф Азгура, чарговае знойдзенае графіці можа стаць адным з экспанатаў. Нагадаю, што пасля экспертызы было пацверджана аўтарства Азгура, — распавядае карэспандэнту «Звязды» **дырэктар музея «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва» Андрэй ДУХОЎНІКАЎ**.



Пачатак надпісу.

Рэстаўрацыйныя работы ў будынку плануецца завяршыць ужо ў 2016 годзе. На думку **старшыні Віцебскага гарвыканкама Віктара НІКАЛАЙКІНА**, які нядаўна там пабываў, рэальна — у канцы вясны. Задача — аднавіць яго максімальна ў такім выглядзе, якім ён быў калісьці. Спачатку дом належаў банкіру Ізраілю Вішняку. А пачынаючы з 1918 года, у ім размяшчаліся: Вышэйшае народнае мастацкае вучылішча, майстэрні Заснавальнікаў новага мастацтва, Свабодныя мастацкія майстэрні, мастацка-практычны інстытут.

Захаваўся план будынка, зроблены ў 1923 годзе. Добрая дапамога музейным работнікам і рэстаўратарам і фотаздымкі паслярэвалюцыйнага часу...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
**Фота з архіва Яўгена КАЛБОВІЧА**

■ Асоба

# НА ШЧОДРАЙ НІВЕ РОДНАГА СЛОВА

## Дзякуючы прафесару Валянціне Лемцюговай на карце краіны сталі з'яўляцца паўзабытыя гістарычныя назвы

**У Беларусі і далёка за яе межамі добра вядомы вучоны, доктар філалагічных навук, прафесар Валянціна Лемцюгова. На працягу больш чым 20 гадоў яна ўзначальвала Рэспубліканскую тапанімічную камісію пры НАН Беларусі, з'яўлялася членам Тапанімічнай камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, анамастычнай камісіі пры Міжнародным камітэце славістаў. Колькасць яе навуковых распрацовак проста ўражвае. Акрамя таго, яна выхавала цэлую генерацыю кваліфікаваных мовазнаўцаў і спецыялістаў у галіне анамастыкі. Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з яе калегам, старшынёй Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігарам КАПЫЛОВЫМ, каб распытаць пра прафесійны лёс таленавітага мовазнаўцы, якая днямі адсвяткавала 80-годдзе.**

***— Напэўна, вялікая ўдача — працаваць побач з такім чалавекам, як Валянціна Пятроўна?***

— Яна належыць да той кагорты людзей, чыё жыццё — яскравы прыклад працалюбства, прынцыповасці і адданасці айчыннай мовазнаўчай навуцы і любімай справе, звязанай з даследаваннем і папулярызацыяй роднага слова. Душэўная заклапочанасць і шчырае хваляванне за лёс беларускай мовы, роднай краіны заўсёды вызначаюць гэтага нераўнадушнага, вернага свайму прафесійнаму абавязку чалавека. Яна аўтарытэтны вучоны і глыбокі даследчык, у якога ёсць чаму павучыцца.

***— На рахунку Валянціны Лемцюговай стварэнне шматлікіх слоўнікаў...***

— Так, у гісторыі беларускай навукі яна вядома як аўтар шматлікіх прац у галіне лексікалогіі і лексікаграфіі, анамастыкі, дыялекталогіі, сучаснай беларускай мовы, гісторыі і культуры мовы. Валянціна Пятроўна прымала ўдзел у стварэнні



«Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» — выдання, якое было адзначана Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь. Удзельнічала ў выкананні аўтарытэтнага міжнароднага навуковага праекта, у якім задзейнічаны навукоўцы ўсіх славянскіх краін і Германіі, «Агульнаславянскі лінгвістычны атлас». З'яўляецца суаўтарам шэрагу буйных калектыўных лексікаграфічных прац, такіх як «Руска-беларускі слоўнік грамадска-палітычнай тэрміналогіі», «Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне», «Руска-беларускі слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі». Настаўнікі-філолагі добра ведаюць яе «Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы», «Слоўнік-даведнік «Кіраванне ў беларускай і рускай мовах», «Кароткі слоўнік беларускай мовы».

А яе «Украінска-беларускі слоўнік» стаў першым у беларускай і славянскай лексікаграфіі. Яго выхад у свет адзначаны як падзея ў культурным і навуковым жыцці не толькі Беларусі і Украіны, але і ў Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Англіі, Бельгіі, Румыніі, Канадзе.

***— Распавядзіце пра даследаванні мовы газеты «Наша Ніва», над якім працавала Валянціна Пятроўна.***

— Сапраўды яна з'яўляецца ініцыятарам, навуковым кіраўніком і аўтарам комплексу навуковых прац, прысвечаных вывучэнню мовы «Нашай Нівы» — унікальнага пісьмовага помніка эпохі беларускага нацыянальнага адраджэння пачатку ХХ стагоддзя. Падрыхтаваны пад яе кіраўніцтвам «Слоўнік мовы «Нашай Нівы» з'яўляецца крыніцай раней нікім не даследаваных лексічных рэсурсаў, ён адлюстроўвае карціну моўнай арганізацыі пачатковага этапу станаўлення новай беларускай літаратурнай мовы з усімі ўласцівымі ёй рысамі і супярэчнасцямі, паказвае яе лексіка-фразеалагічныя адметнасці, перадае адчуванне яе шырыні і глыбіні.

***— Раскажыце пра працу Валянціны Лемцюговай у галіне анамастыкі.***

— Яна вядучы спецыяліст у гэтым. З імем Валянціны Пятроўны цесна звязана развіццё напрамкаў анамастычнай школы, заснаванай у 60-я гады мінулага стагоддзя акадэмікам Мікалаем Бірылам. Ёю распрацаваны тэарэтычныя асновы стандартызацыі беларускіх геаграфічных назваў. Гэтыя распрацоўкі знайшлі шырокае прымяненне пры падрыхтоўцы і выданні розных па тэматыцы і маштабе карт, атласаў. Асобнае месца займае падрыхтаваны пад непасрэдным кіраўніцтвам Валянціны Пятроўны нарматыўны даведнік «Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь» у 6 кнігах. Гэтае выданне атрымала высокую ацэнку экспертаў камісіі па стандартызацыі пры ААН, якія рэкамендавалі яго ў якасці ўзору для іншых краін.

***— Несумненна, не меншай увагі заслугоўвае і яе кніга «Тапонімы распавядаюць».***

— Там змешчана каля трох тысяч навукова-папулярных эцюдаў пра паходжанне назваў беларускіх паселішчаў (айконімаў), таксама тлумачыцца сэнс многіх гідронімаў (назваў рэк, азёр, балот) і антрапонімаў (уласных асабовых імён і прозвішчаў). Кніга выклікала вялікую цікавасць не толькі ў спецыялістаў, але і ў шырокага кола чытачоў, неабыякавых да мінулага сваёй малой і вялікай Радзімы. Прафесар Мікалай Прыгодзіч слушна адзначыў, што «дзякуючы прынцыповасці і настойлівасці прафесара Лемцюговай на карце Беларусі, у многіх гарадах і мястэчках сталі з'яўляцца паўзабытыя гістарычныя назвы, аднаўляецца старажытны таманімікон беларускага народа».

***— З нагоды 80-годдзя Валянціны Лемцюговай у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі сабраліся яе калегі. Пэўна, гучала шмат добрых пажаданняў?..***

— Так, мы нават зладзілі круглы стол з гэтай нагоды, які называўся «На шчодрай ніве роднага слова». Сябры, вучні, аднадумцы Валянціны Пятроўны казалі ў яе адрас цёплыя словы. Дарэчы, у Валянціны Пятроўны цудоўная сям'я, у якой яна заўсёды знаходзіць падтрымку і разуменне, перадае сваю мудрасць і жыццёвы вопыт. Дачка Ірына пайшла па мацярынскіх слядах і дасягнула вышынь філалагічнай навукі, таксама стала доктарам навук...

— Прафесар Адам Мальдзіс расказваў аб тым, як дапамагаюць працы Лемцюговай раскрыць таямніцы паходжання беларускіх прозвішчаў. Асаблівую цікавасць выклікала выступленне навуковага супрацоўніка Інстытута мовазнаўства Уладзіміра Кошчанкі «Ад геаграфічнай лацінкі да нацыянальнай сістэмы раманізацыі беларускай мовы», у якім аўтар прапанаваў не абмяжоўваць Інструкцыяй па перадачы літарамі лацінскага алфавіта ўласных геаграфічных назваў, а распрацаваць стандарт, які б распаўсюджваўся ва ўсіх выпадках, калі трэба забяспечыць адназначнае прадстаўленне кірылічнага тэксту лацінскімі літарамі. Такая цікавая навуковая дыскусія, несумненна, стала выдатным падарункам да юбілею.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** nina@zviazda.by

■ Цікавае побач

# ЗАГАДАЦЬ ЖАДАННЕ І ПАСЯДЗЕЦЬ У БОЖЫМ КРЭСЛЕ

## можна ў Крупскім гісторыка-краязнаўчым музеі

**— На тэрыторыі музея мы пасадзілі бярозку. Менавіта бярозка — сімвал чысціні, спагады, добрых намераў. Гэта своеасаблівы абярэг. Яе галінкі, нібы шаўковыя дзявочыя косы, атульваюць чалавека пяшчотай, — распавяла дырэктар Тамара БАЛЬБОТ. — Да нас прыязджалі маладажоны пасля заключэння шлюбу разам са сваімі гасцямі, каб па народных абрадах адсвяткаваць вяселле. Пасля заканчэння цырымоніі мы ім прапаноўвалі дастаць са старадаўняга глінянага гаршка стужку і пры гэтым загадаць жаданне. У ёмістасці стужкі чатырох колераў: белы сімвалізуе паветра, чырвоны — агонь, блакітны — ваду, зялёны — зямлю. Не чорны, а менавіта зялёны, што азначае ўрадлівасць, багацце, рост. Потым з'явілася ідэя вешаць стужкі на бярозку і прасіць, каб мара спраўдзілася. Дрэва расце, а разам з гэтым становяцца мацнейшымі жаданні. Пасля традыцыя распаўсюдзілася на ўсіх наведвальнікаў, прыжылася. І ўжо людзі спецыяльна пачалі прыходзіць у музей, каб прыхіліцца да стромкай беластвольнай прыгажуні, абвязаць яе галінкі стужкай.**

Камень-валун «Божае крэсла» здаўна стаяў на ўскрайку вёскі Сомры, якая адна з першых была спалена фашыстамі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Яна так і не адрадзілася. Першы дырэктар музея Таццяна Якаўлеўна Белая вырашыла перавезці культавы валун на тэрыторыю ўстановы. У гэтага каменя вельмі цікавая гісторыя.

Раней нашы продкі былі язычнікамі. Не ўсе з іх прынялі хрысціянства, якое распаўсюджвалася ў першым стагоддзі нашай эры на землях Еўропы. Як сведчыць паданне, у вёсцы Сомры хрысціяне вырашылі паставіць капліцу побач з валуном на перакрыжаванні дарог. Гэта не спадабалася язычнікам. На світанні яны з факеламі, сякерамі, віламі пайшлі да святыні, каб знішчыць яе. Але раптам на небе з'явілася воблака, на якім сядзеў мужчына ў белым убранні. Ваяўніча настроеныя людзі спалохаліся, разгубіліся. Незнаёмец сышоў на зямлю і прыхіліўся да валуна. Ён пацікавіўся ў язычнікаў, за што яны хочуць пакараць сваіх суплеменнікаў: можа, яны лайдакі, не выхоўваюць сваіх дзяцей, не любяць сваіх жонак, не паважаюць старэйшых. «Яны вераць у аднаго Бога! За гэта іх трэба забіваць!» — быў адказ. «Верце ў сваіх багоў, а яны няхай вераць у свайго Бога, нічога заганнага ў гэтым няма», — спрабаваў спыніць натоўп чалавек. Але не ўсе яго паслухалі. І тады ён непаслухмяных ператварыў у россып камянёў. Воблака зноў апусцілася на зямлю, і прышэлец знік. А людзі ўбачылі, што на валуне, які быў круглы, з'явілася паглыбленне. Да яго пачалі прыходзіць і малы, і стары, пакланяцца яму, прасіць здароўя для сябе, сваіх блізкіх і здзяйснення самых патаемных мар і жаданняў.

**Як сведчыць паданне, у вёсцы Сомры хрысціяне вырашылі паставіць капліцу побач з валуном на перакрыжаванні дарог. Гэта не спадабалася язычнікам. На світанні яны з факеламі, сякерамі, віламі пайшлі да святыні, каб знішчыць яе. Але раптам на небе з'явілася воблака, на якім сядзеў мужчына ў белым убранні.**

Калі волата перавезлі, то высветлілася, што ён не суцэльны, а зросся з некалькіх камянёў. Дзіўна: калі глядзіш на яго зверху, то бачыш выяву, якая нагадвае твар Божай маці. Падыходзіш з другога боку — малюнак мяняецца: Багародзіца з малым дзіцем на руках.



Сядзіба Свяцкіх у Крупках.

— Аднойчы ў нас быў наведвальнік з Мінска, сфатаграфаваў каля гэтага каменя сваю дачушку. Потым прыехаў у наступны раз і кажа, маўляў, у вас незвычайны камень: на здымку вакол яго праявілася свячэнне, — працягвае Тамара Уладзіміраўна. — З вёскай Сомры звязаны яшчэ адзін незвычайны факт, які пісьмова засведчылі для нашага музея двое мужчын. Пасля выпускнога вечара ў школе хлопцы заседзеліся да позняга на прызбе каля хаты. І раптам з заходняга боку вёскі пачаўся брэх сабак. Як хваля, ён пракаціўся ў другі канец сяла. Стала страшна, жудасна. Падлеткі заўважылі, што над пшанічным полем узвышаецца велізарны цёмны сілуэт. Ён набліжаўся, нагадваў фігуру жанчыны ў чорным адзенні.

«Мы чулі нейкія гукі, бразганне зброі, плач, стогны. Ад страху схаваліся пад мост і там прасядзелі, пакуль усё сціхлася. Прыйшлі дадому і ляглі спаць, а калі прачнуліся, то даведаліся, што на світанні пачалася вайна», — напісалі яны.

Да «Божага крэсла» больш падыходзяць сталыя людзі, а вось дзецям даспадобы «Цар-жаба». Сапраўды, наверсе яго выразна відаць абрысы жабы, прыплюшчаныя вочы, нібыта грэецца пад пяшчотнымі праменямі сонца.

— У Максіма Багдановіча ёсць цікавая легенда пра цар-жабу, царзмея. А натхнілі паэта на іх напісанне расповеды бабулі. На Узвіжанне ў лесе звяры збіраюцца на сход. Бласлаўляе іх на зімнюю спячку цар-жаба або цар-змей. І калі чалавек выпадкова аказаўся ў гэты час у лесе, то не павінен парушаць спакой прыроды і яе насельнікаў. Заўважыў, што паўзе шмат змей ці скача шмат жаб, трэба прыпыніцца, скінуць з галавы хусцінку, развязаць пояс або дастаць насоўку і разаслаць перад імі. Прапаўзлі — надзень на сябе і будзеш валодаць вялікімі здольнасцямі. У гэта верылі нашы продкі, бо жабы ніколі не прыносілі людзям шкоду. Іх кідалі ў малако, каб не пракісла, імі лячыліся, яны знішчалі шкоднікаў у агародзе. Дарэчы, плануем у перспектыве перавезці ў двор музея яшчэ адзін валун, на якім высечана вялікая зорка, — дадала Тамара Бальбот. — Праўда, адкуль і калі яна там з'явілася ніхто не ведае.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** lazovskaya@zviazda.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ КАПИТАЛЬНЫХ СТРОЕНИЙ (ЗДАНИЙ, СООРУЖЕНИЙ, ИЗОЛИРОВАННЫХ ПОМЕЩЕНИЙ, МАШИНО-МЕСТ, ИХ ЧАСТЕЙ), НАХОДЯЩИХСЯ В ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ

**Государственное учреждение**

## «Национальная библиотека Беларуси»

**извещает о проведении аукциона по продаже права заключения договора аренды помещений, находящихся в республиканской собственности**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **Право заключения договора аренды капитального строения сроком на 5 (пять) лет** | Назначение: объект для организации общественного питания и торговли в здании Национальная библиотека Беларуси. Количество этажей – 2. Общая площадь – 1 729,65 кв.м. Техническое состояние – удовлетворительное |
| **Местоположение объекта** | г. Минск, просп. Независимости, 116 |
| **Начальная цена продажи права** | 15 566 850 (Пятнадцать миллионов пятьсот шестьдесят шесть тысяч восемьсот пятьдесят) рублей |
| **Сумма задатка (10%)** | 1 556 685 (Один миллион пятьсот пятьдесят шесть тысяч шестьсот восемьдесят пять) рублей |
| **Сумма арендной платы в месяц** | 1 383,72 (Одна тысяча триста восемьдесят три целых семьдесят две сотых) базовой арендной величины, в т.ч. НДС (20%) 230,62 (Двести тридцать целых шестьдесят две сотые) базовой арендной величины |
| Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. №150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом». Коэффициент, устанавливаемый в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду, – 2,0 | |
